Сакрэты «Гістарычнага слоўніка»

СТАР. 4

Нашы і не толькі на «Еўрабачанні»

СТАР. 5

Трыумфальны сезон «Мінчанкі»

СТАР. 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 МАЯ 2018 г. СУБОТА № 85 (28701)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

САМАЕ ПРЫГОЖАЕ СПАБОРНІЦТВА

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прысутнічаў на фінале нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2018».

Спаборніцтва паміж самымі прыгожымі дзяўчатамі краіны завяршылася на сцэне Палаца спорту. Разам з кіраўніком краіны ў глядзельнай зале «хварэлі» за ўдзельніц шоу 3,5 тысячы чалавек.

У кастынгах узялі ўдзел больш за 700 юных беларусак, аднак толькі 30 сталі фіналісткамі. Гледачы ўбачылі некалькі дэфіле, першае з іх — візітная картка. Падчас яе дзяўчаты прэзентавалі сябе не толькі гледачам у зале, але і тэлеаўдыторыі. Далей — выхад у нацыянальных строях, упершыню ў гісторыі конкурсу сюды ўвялі элементы харэаграфіі. Трэцяе дэфіле — выхад у купальніках, яго тэмай сталі ІІ Еўрапейскія гульні. Апошняя дэфіле — у вячэрніх сукенках.

Конкурс таксама быў насычаны шоу-нумарамі з выступленнем зорак беларускай і расійскай эстрады. Падрабязнасці свята прыгажосці чытайце на сайце «Звязды» і ў найбліжэйшым нумары газеты.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

МАЛАЯ РАДЗІМА ІВАНА І КАЦЯРЫНЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нашы даўнія падпісчыкі — Іван і Кацярына ПАПЕЧЫЦЫ з вёскі Аброва Івацэвіцкага раёна (яны выпісваюць «Звязду» ўжо амаль трыццаць гадоў) гэтымі днямі адзначылі залатое вяселле. Маладая настаўніца, якая па размеркаванні прыехала ў старажытную вёску, і калгасны шафёр, дэмабілізаваны з арміі, стварылі моцную і працавітую сям'ю. Маладыя засталіся на малой радзіме Івана, пабудавалі сабе дом, нарадзілі дзяцей. А цяпер ужо радуюцца і дарослым унукам. Пра сваё сяброўства з нашай газетай Іван Пятровіч і Кацярына Цімафееўна кажуць: «Не ўяўляем жыцця не толькі без сваёй вёскі, але і без «Звязды» таксама, бо газета стала для нас роднай!»

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Антон БЫЧКОЎСКІ, афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:

«Беларускія пагранічнікі гатовыя да работы ва ўмовах правядзення ў Расіі чэмпіянату свету па футболе. Балельшчыкі, каманды, абслуговы персанал будуць праходзіць пагранічны кантроль у міжнародных пунктах пропуску на знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы. Якіх-небудзь дадатковых кантрольных мерапрыемстваў у дачыненні да гэтай катэгорыі замежных грамадзян не прадугледжана. Разам з тым Дзяржпагранкамітэт чакае некаторага павелічэння пасажырапатоку. У гэтых умовах у пунктах пропуску з гледзішча арганізацыі пагранконтролю пры неабходнасці будуць узмоцнены пагранічныя нарады па праверцы дакументаў для забеспячэння бесперабойнага і рытмічнага пропуску грамадзян праз мяжу Беларусі».

■ Парламенцкі дзённік

СЯБРОЎСТВА І ДАВЕР ЯК АСНОВА ПАРТНЁРСТВА

Старшыня верхняй палаты парламента расказаў кітайскім журналістам пра аспекты двухбаковай інтэграцыі

Шосты — фінальны — дзень насычанага тура прадстаўнікоў СМІ Кітая па Беларусі пачаўся з прэс-канферэнцыі старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА. На сустрэчы прысутнічалі рэпарцёры цэнтральных і рэгіянальных медыя Паднябеснай. Журналісты цікавіліся пытаннямі эканамічнага, навуковага, міжпарламенцкага ўзаемадзеяння дзвюх краін. Надзённыя тэмы — развіццё транспартных зносін і перспектывы партнёрства ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў: «Мы даражым адкрытымі і сяброўскімі адносінамі з кітайскім народам». Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў унікальнасць беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, якое набыло аспект сумеснага развіцця.

Лейтматывам сустрэчы з журналістамі стала эканамічная інтэграцыя. Ад звычайнага гандлю трэба пераходзіць да маштабных праектаў — сумесных кампаній, нават з рэзідэнтамі трэціх краін. «Гэта стане каталізатарам развіцця: прамысловая кааперацыя, сумесны бізнес, фінансавыя праекты. Я падкрэсліваю: як на тэрыторыі Кітая, так і ў Беларусі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. У якасці прыкладу сенатар прывёў прадпрыемства «БелДжы», індустрыяльны парк «Вялікі камень», дзе створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для бізнесу.

Фота БелТА.

Цікавіліся журналісты і праектамі ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях».

— Мы бачым галоўную задачу ў спалучэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху і Еўразійскага эканамічнага саюза. На мой погляд, тут галоўнае не хуткасць, а стабільная і эфектыўная работа. Таму што тэма дастаткова далікатная, мы павінны ўлічваць усе інтарэсы. Мы лічым, што ініцыятыва «Адзін пояс і адзін шлях» вельмі правільная, і мы з ёй звязваем вялікія надзеі, — сказаў спікер Савета Рэспублікі.

Праект Шаўковага шляху спрыяе і развіццю супрацоўніцтва ў сферы чыгункі. За апошнія сем гадоў у чыгуначную гаспадарку Беларусі інвеставана два з паловай мільярды долараў.

Сапраўднай «жамчужынай» праекта «Адзін пояс і адзін шлях» называюць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Сёння сярод яго рэзідэнтаў 33 кампаніі з Беларусі, Кітая, Еўропы і Амерыкі. Плануецца, што да канца года іх колькасць павялічыцца да 40.

СТАР. 2

■ Фінансы

НАМ БЫ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ У РУБЛІ...

У аснове высокіх інфляцыйных чаканняў ляжыць перш за ўсё псіхалагічны фактар

Гэта адзначыў у сваім дакладзе на пашыраным пасяджэнні праўлення начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Дзмітрый МУРЫН. Па сутнасці, даклад гэты быў прысвечаны вынікам рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі за студзень — сакавік гэтага года.

Індэкс эканамічных настрояў у плюсе

Па словах Дзмітрыя Мурына, за І квартал года наша эканоміка выраслa на 5,1 %, а дадатны ўклад у прырост ВУП зрабілі ўсе асноўныя віды дзейнасці.

Нароўні з паляпшэннем фактычнай сітуацыі застаюцца аптымістычнымі і эканамічныя чаканні дзелавых колаў. Вычышчаны ад сезоннасці зводны індэкс эканамічных настрояў, разлічаны Нацыянальным банкам паводле маніторынгу прадпрыемстваў, на працягу шасці месяцаў знаходзіцца ў дадатнай зоне. Такія чаканні рэальнага сектара спрыялі актывізацыі інвестыцыйнай актыўнасці прадпрыемстваў і павелічэнню заработнай платы работнікаў.

Разам з тым рост рэальнай заработнай платы і даходаў насельніцтва тэмпамі, якія апярэджваюць дынаміку прадукцыйнасці працы, стварае перадумовы для ўзмацнення інфляцыйнага ціску як у цяперашні час, так і ў найбліжэйшай перспектыве.

У прыватнасці, на спажывецкім рынку ўжо назіраецца высокая актыўнасць насельніцтва. Толькі за студзень — сакавік рознічны тавараабарот павялічыўся амаль на 10 % да адпаведнага перыяду мінулага года. Пры гэтым узмацняецца попыт насельніцтва на тавары замежнай вытворчасці, перш за ўсё нехарчовыя. Так, іх доля ў рознічным тавараабароце арганізацый гандлю павялічылася з 54,2 % у 2016 годзе да 55,8 % летась.

СТАР. 2

■ Прыёмная кампанія — 2018

ВЫБАР — З ЧАТЫРОХ СЕРТЫФІКАТАЎ ЦІ... З ВАСЬМІ

Якія магчымасці адкрываюцца перад маладымі людзьмі?

Абітурыенты, якія здавалі летась цэнтралізаванае тэсціраванне, але ім па нейкай прычыне не пашчасціла стаць студэнтамі, пры жаданні змогуць паспрабаваць паступіць са сваімі сертыфікатамі ў гэтым годзе. Правіламі прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі тэрмін дзеяння сертыфікатаў быў павялічаны да двух гадоў. Таму прыёмныя камісіі будуць прымаць у абітурыентаў як сертыфікаты ўзору 2018 года, так і вынікі здачы ЦТ у 2017 годзе. Таксама ў прэтэндэнта на студэнцкі білет ёсць магчымасць выбраць з вынікаў здачы ЦТ за два гады сертыфікаты з найлепшымі для сябе баламі і заявіць у прыёмную камісію, скажам, сертыфікат па матэматыцы за 2017 год, а па фізіцы — за 2018-ы. Ці выбраць найлепшы сертыфікат ЦТ па дзяржаўнай мове.

— Спрагназаваць, колькі будзе выкарыстана мінулагодніх сертыфікатаў, вельмі складана. Я ўпэўнены, што большая частка абітурыентаў усё ж такі задаволіла свае прафесійныя памкненні і ўжо атрымлівае адпаведную адукацыю, — падзяліўся сваім меркаваннем **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.** — Але хачу нагадаць, што сёлета былі скарэктаваныя парогавыя значэнні па першым профільным прадмеце ўступных выпрабаванняў — яны павысіліся на 5 балаў. На гэта абітурыентам трэба звярнуць увагу, калі яны будуць фарміраваць пакет сваіх сертыфікатаў. Таксама былі скарэктаваныя і ніжнія парогавыя значэнні для паступлення на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю і сілавога блока: мінімальны парог там цяпер складае 7 балаў.

СТАР. 4

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СМІ ДАВЕДАЛІСЯ ПРА ЗАГАД ТРАМПА ПАДРЫХТАВАЦЬ ВЫВАД КАНТЫНГЕНТУ З ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп аддаў загад Пентагону падрыхтаваць варыянты скарачэння амерыканскага ваеннага кантынгенту ў Паўднёвай Карэі, паведамляе газета The New York Times са спасылкай на свае крыніцы.

Скарачэнне ваеннага кантынгенту не будзе адным з прадметаў торгу на перамовах Трампа з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам, якія павінны адбыцца ў найбліжэйшы час, адзначылі крыніцы NYT. Па словах аналітыкаў, падпісанне мірнага дагавора паміж Паўднёвай Карэяй і КНДР знізіць неабходнасць знаходжання на паўвостраве 23,5 тысячы амерыканскіх ваеннаслужачых.

Трамп і раней хацеў скараціць кантынгент у Паўднёвай Карэі, ён заяўляў, што ЗША не атрымліваюць адэкватнай кампенсацыі за размяшчэнне вайскоўцаў. Паводле пагаднення, якое заканчваецца ў канцы 2018 года, Паўднёвая Карэя аплачвае ЗША палову сумы, што траціцца на ўтрыманне кантынгенту, — $800 млн у год. Адміністрацыя Трампа пры гэтым патрабуе, каб саюзніца цалкам аплачвала іх утрыманне.

УРУЧЭННЕ НОБЕЛЕЎСКАЙ ПРЭМІІ ПА ЛІТАРАТУРЫ АДМЯНІЛІ З-ЗА СЕКС-СКАНДАЛУ

Фонд Нобеля падтрымаў ініцыятыву Шведскай акадэміі і прыняў рашэнне адкласці на год прысуджэнне прэміі па літаратуры ў 2018 годзе. Пра гэта гаворыцца ў прэс-рэлізе на сайце арганізацыі.

«На працягу апошніх некалькіх тыдняў мы вялі беспарапынны дыялог са Шведскай акадэміяй, і мы падтрымліваем яе рашэнне адмяніць ўручэнне ўзнагароды ў 2018 годзе», — гаворыцца ў паведамленні фонду, які, згодна з шведскім законам, нясе адказнасць за рэалізацыю завяшчання Альфрэда Нобеля і ўзнагароджанне лаўрэатаў.

На працэс прысуджэння прэмій у іншых абласцях у 2018 годзе, як адзначылі прадстаўнікі гэтай арганізацыі, рашэнне не паўплывае. Яно, як паказвае Reuters, было прынята ў сувязі з секс-скандалам, з-за якога шэраг членаў Шведскай акадэміі яе пакінулі.

«Крызіс у Шведскай акадэміі адмоўна адбіўся на Нобелеўскай прэміі. Рашэнне адмяніць уручэнне ўзнагароды ў 2018 годзе падкрэслівае сур'ёзнасць сітуацыі і дапаможа захаваць доўгатэрміновую рэпутацыю ўзнагароды», — упэўнены ў фондзе Нобеля.

ДЗЯРЖДУМА 8 МАЯ МОЖА РАЗГЛЕДЗЕЦЬ КАНДЫДАТУРУ ПРЭМ'ЕРА, КАЛІ ЯНА БУДЗЕ ЎНЕСЕНА



Дзяржаўная дума на пленарным пасяджэнні ў аўторак, 8 мая, можа разгледзець кандыдатуру на пасаду прэм'ер-міністра Расіі, калі яна будзе ўнесена да гэтага часу прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. Пра гэта паведаміў у пятніцу ТАСС першы віцэ-спікер ніжняй палаты парламента Іван Мельнікаў.

«8 мая плануецца пасяджэнне Дзярждумы. У выпадку, калі да гэтага моманту прэзідэнтам будзе ўнесена кандыдатура прэм'ера, яна можа быць разгледжана на гэтым пасяджэнні», — сказаў Мельнікаў.

Інаўгурацыя прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна адбудзецца 7 мая. Згодна з канстытуцыяй краіны, не пазней як у двухтыднёвы тэрмін пасля ўступлення на пасаду прэзідэнт павінен прадставіць на ўзгадненне Дзярждуме кандыдатуру старшыні ўрада, на разгляд якой дэпутатам адведзены тыдзень.

КАРАТКА

Беларускія дзіцячыя кардыяхірургі ўпершыню ў краіне зрабілі аперацыю па замене клапана лёгачнай артэрыі празскурным доступам праз прасвет сасуда.

Мотаклуб AnGirls грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» сёння праводзіць мотапарад. Такім чынам беларускія матацыкласткі далучыліся да акцыі JUST RIDE, якая ўжо 12-ы раз праводзіцца ў свеце і другі — у Беларусі.

У краіне павялічаны грашовыя нормы расходаў на дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот.

Каля 300 мінамётных мін выяўленыя пры ўзворванні на полі ва Ушацкім раёне. Снарады знаходзіліся на двух участках памерам 2-3 метры, размешчаных побач. Боепрыпасы вывезены сапёрамі ў бяспечнае месца і знішчаны.

■ Вёска будучага

Годныя ўмовы працы, быту і заробкі,

або У чым паспяховасць сучаснага аграгарадка?

Вёска Лазавічы знаходзіцца дзесьці за дваццаць пяць кіламетраў ад Клецка, можна сказаць, на самым ускрайку раёна. Паскоранае яе развіццё пачалося ў 2007 годзе, з наданнем статусу аграгарадка.

Сямейная дынастыя: Анатоль БАРНАТОВІЧ, Жанна НІКАНОВІЧ і Галіна ПАЮТА.

— Аграгарадок Лазавічы рос і мяняўся на нашых вачах. Былі заасфальтаваны вуліцы, пад'езды да фермаў, вытворчых аб'ектаў, уладкаваны тратуарныя дарожкі. З'явілася ўся неабходная сацыяльная інфраструктура, выраслa новая вуліца Маладзёжная. Базавая гаспадарка — адкрытае акцыянернае таварыства «Лазавічы» выдзяляла тут жыллё ў асноўным моладзі, — кажа **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Галіна ПАЮТА.**

Дарэчы, акрамя яе ў Лазавічах жывуць і працуюць родныя брат і сястра Галіны Адамаўны — Анатоль Барнатовіч — брыгадзірам трактарнай брыгады, Жанна Нікановіч — загадчыцай сталовай. Сапраўдная сямейная дынастыя.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

СЯБРОЎСТВА І ДАВЕР ЯК АСНОВА ПАРТНЁРСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адзін актуальны аспект для інтэграцыі — Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва. У 2015 годзе Беларусь атрымала ў ёй статус наглядальніка. І па сутнасці, сёння краіна з'яўляецца заходнімі варотамі аб'яднання. «Мы гуляем на гэтым полі, не сядзім на лаве запасных. Таму наша краіна актыўна падтрымлівае работу па расшырэнні ШАС. ШАС імкліва становіцца адной з самых уплывовых міжнародных арганізацый. І асабліваю каштоўнасць набывае працэс збліжэння краін ва ўмовах большага ўзмацнення рэгіянальных канфліктаў. Гэта вельмі важная арганізацыя. Сёння яна аб'ядноўвае больш за палову насельніцтва планеты», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч.

Плануецца, што ў чарговым саміце ШАС (ён адбудзецца ў чэрвені 2018 года ў горадзе Цындаа) возьме ўдзел Прэзідэнт Беларусі. Магчыма, на палях мерапрыемства адбудзецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з лідарам Кітая Сі Цзіньпінам.

На прэс-канферэнцыі ў Савеце Рэспублікі таксама прысутнічалі міністры прамысловасці, фінансаў і эканомікі Беларусі, прадстаўнікі іншых ведамстваў і арганізацый.

Міністр прамысловасці Віталь Воўк пракаментаваў дасягненні ў рэгіянальным супрацоўніцтве з правінцыяй Хубэй: «Мінскі завод колавых цягачоў у далёкім 1998 годзе арганізаваў сумеснае прадпрыемства «Санцзян-Волат». Яно працуе і сёння».

Міністэрства фінансаў Беларусі ўскладае вялікія надзеі на інвестыцыйнае супрацоўніцтва з Кітаем. Распрацоўваецца ідэя беларуска-кітайскага інвестыцыйнага фонду. Як мяркуецца, гэты праект будзе спрыяць далейшаму развіццю сумесных ініцыятыў.

Гэты год праходзіць пад знакам Года турызму Беларусі ў Кітаі. Прэзентацыя патэнцыялу нашай краіны ў гэтым напрамку стала адной з мэт прэс-тура. Тысячы кіламетраў паміж краінамі не перашкаджаюць развіццю сяброўскіх адносін. Зараз абмяркоўваюцца праекты па наладжванні авіязносін з рэгіёнамі Паднябеснай. Мяркуецца, што значным вынікам Года турызму можа стаць падпісанне пагаднення аб адмене віз паміж краінамі на перыяд да 30 дзён.

Марыя ДАДАЛКА.

■ Медыяпрастора

КРАЯЗНАЎЧЫ ВЕКТАР

Тэма Года малой радзімы яскрава прадстаўлена на выстаўцы СМІ

Сёння завяршаецца XXII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі». Шмат цікавага адбывалася і адбываецца гэтымі днямі не толькі на тэрыторыі ўсяго выставачнага павільёна «БелЭкспа», але і на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда». У прыватнасці, адной з асноўных стала тэма Года малой радзімы.

Газета «Звязда» сумесна з «Настаўніцкай газетай» правялі круглы стол па тэме «Вывучэнне малой радзімы: вопыт, праблематыка, перспектывы». Асноўнай аўдыторыяй канферэнц-залы, дзе змяшчаецца каля 70 чалавек, сталі настаўнікі — людзі, якія першымі выхоўваюць патрыятызм у маладога пакалення. Менавіта настаўнікі прыйшлі, каб паслухаць, як у іншых установах адукацыі і культуры вядзецца краязнаўчая работа, каб натхніцца на далейшую плённую дзейнасць.

Перад прысутнымі выступіў дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел Сапоцька, які расказаў, як гістарычны музей, некаторыя грамадскія арганізацыі, з якімі ён супрацоўнічае, праводзяць краязнаўчую працу. Гісторык, выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксей Загідулін расказаў пра гістарычнае і філалагічнае краязнаўства, пра тое, як з гэтымі тэмамі працуюць у вышэйшых навучальных установах.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сярод астатніх выступоўцаў былі пераважна настаўнікі, якія непасрэдна на месцах займаюцца тэмай малой радзімы. Загадчык аддзела краязнаўства і патрыятычнага выхавання Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Аляксандра Кравец расказала пра сістэму краязнаўчай работы ва ўстановах адукацыі краіны. Настаўніца гісторыі і грамадазнаўства Жамчужненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна Ірына Дубейка паведала пра выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій пры вывучэнні малой радзімы. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік гісторыка-краязнаўчага музея «Невычэрпная крыніца гісторыі» Гімназіі № 25 г. Мінска Аліна Пахвалёная падзялілася сваім бачаннем вялікага горада як малой радзімы. (Аб чым яшчэ гаварылі падчас круглага стала, мы падрабязней напішам у наступным нумары.)

Адметна, што тэма краязнаўства была закранута і на больш высокім узроўні. Кастрамская абласная газета «Северная правда» і газета «Звязда» запланавалі абмен краязнаўчымі матэрыяламі. Гэта прадугледжана пагадненнем аб супрацоўніцтве, якое падпісалі выданні.

Варвара ГОМАН

Супрацоўніцтву быць

Выдавецкі дом «Звязда» падпісаў дагавор з рэдакцыяй кастрамской абласной газеты «Северная правда»



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Учора два беларускія і два кастрамскія СМІ сталі бліжэй адзін да аднаго. Разам са «Звяздой» пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі Белтэлерадыёкампанія і абласная тэлерадыёкампанія «Русь». Пагадненне было падпісана ў прысутнасці Міністра інфармацыі Беларусі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА і начальніка інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Кастрамской вобласці Ірыны ЖАБКО.

Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», падкрэсліў, што «міжнароднае супрацоўніцтва ў інфармацыйнай сферы — адзін з прыярытэтаў дзейнасці. У нас ужо ёсць вопыт падобнага супрацоўніцтва з кітайскім бокам. Павел Сухарукаў лічыць, што развіццё супрацоўніцтва з Кастрамской вобласцю Расіі ў інфармацыйнай сферы пазітыўна адаб'ецца не толькі на культурных кантактах, але і на сацыяльна-эканамічных адносінах. Гэта ўзаемныя інтарэс і карысць.

У сваю чаргу **Аляксей АНДРЭЕЎ, дырэктар рэдакцыі кастрамской абласной газеты, адзначыў, што ў «Севернай правды»** і «Звязды» шмат агульнага. Абедзве перасягнулі стогадовы ўзрост («Северной правде» летась споўнілася 110 гадоў), абедзве сваім дэвізам абралі рабіць выданне родным (у кастрамскім выданні слоган гучыць як «Родная газета для кожнага жыхара вобласці»). Аляксей Андрэеў выказаў намер стаць так званымі газетамі-пабрацімамі і падкрэсліў, што яго выданню былі б цікавыя матэрыялы па краязнаўстве і турызме Беларусі.

Іван ЭЙСМАНТ, старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, расказаў, што яны імкнуцца максімальна пашыраць геаграфію ўзаемадзеяння. Прапрацоўваецца пагадненне з італьянскай тэлерадыёкампаніяй, на днях былі перамовы з польскім тэлеканалам. Кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі падзяліўся, што з партнёрам з Кастрамы ўжо ёсць адна задума ў культурнай сферы. Хутчэй за ўсё гэта будзе сумесны дакументальны фільм. **Генеральны дырэктар абласной тэлерадыёкампаніі «Русь», член праўлення Саюза журналістаў Расіі Кастрамской вобласці Святлана КНЯЗЕВА** дадала, што іх гледачоў цікавіць Беларусь, асабліва турыстычны кірунак.

Надзея АНІСОВІЧ.

НАМ БЫ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ У РУБЛІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такім чынам, актывізацыя спажывецкага попыту мае важныя наступствы не толькі ў частцы інфляцыйных працэсаў, але і ў збалансаванасці знешняга гандлю.

Спажывецкі імпарт расце

Гадавы аб'ём спажывецкага імпарту ў лютым гэтага года вырас да 7,9 млрд долараў. Для параўнання: у лютым мінулага года ён складаў толькі 6,7 млрд долараў. Пры гэтым асноўны прырост імпарту — звыш 90 % — прыйшоўся на нехарчовыя тавары. Нягледзячы на гэта, у цэлым сітуацыя ў знешнім гандлі ў першыя два месяцы 2018 года склалася трохі лепшая, чым у пачатку мінулага года. Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг вырас на 28,5 %. Станоўчае сальда знешняга гандлю перавысіла 200 млн долараў.

Ключавымі фактарамі такой дынамікі сталі спрыяльная знешняя кан'юнктура, аднаўленне фізічных аб'ёмаў продажу энергарэсурсаў, а таксама рост экспарту паслуг, абумоўлены нарошчваннем экспарту камп'ютарных і транспартных паслуг на фоне павелічэння тавараабароту.

Экспарт неэнерганосьбітаў павялічыўся на 24 %. Пры гэтым яго рост у большай ступені быў сфарміраваны за кошт павелічэння фізічных аб'ёмаў. Разам з тым найбольшы прырост ствараўся за кошт нарошчвання экспарту прамежкавых тавараў з нізкай дабаўленай вартасцю. У сваю чаргу, імпарт неэнерганосьбітаў рос хутчэй (амаль на 31 %), галоўным чынам за кошт імпарту прамежкавых неэнергетычных тавараў.

Насельніцтва валюту прадае

У цэлым за І квартал на ўнутраным валютным рынку сфарміравалася чыстая прапанова замежнай валюты, абумоўленая пераважна яе продажам насельніцтвам. З пачатку года на чыстай аснове фізічныя асобы прадалі 303 млн долараў (годам раней — 500 млн долараў). Скарачэнне чыстага продажу валюты звязана з апераджальным павелічэннем валавога попыту ў параўнанні з прапановай з прычыны росту даходаў насельніцтва.

З'яўленне ў пачатку года на ўнутраным валютным рынку залішняй прапановы прывяло да змянення дынамікі абменнага курса беларускага рубля. Пасля паслаблення нацыянальнай валюты ў другім паўгоддзі 2017 года ў справаздачным квартале яе курс стабілізаваўся. Цана кошыка валют з пачатку года зменшылася на 0,4 %.

Адбылося зніжэнне рэальнага абменнага курса. Гэта, з аднаго боку, дазволіла падтрымаць цэнавую канкурэнтаздольнасць айчыннага экспарту — толькі за мінулы год рэальны курс нашага рубля, разлічаны па індэксе цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі, знізіўся на 6,8 %. Але з іншага боку, улічваючы недаацэненасць беларускага рубля, гэта стварае дадатковы інфляцыйны ціск у краіне, у тым ліку праз захаванне павышаных інфляцыйных чаканняў.

Самі не верым у малую інфляцыю

Дзмітрый Мурын адзначыў, што, паводле апытанняў насельніцтва і кіраўнікоў прадпрыемстваў, інфляцыйныя чаканні зніжаюцца досыць павольна. Пры гэтым бягучая і чаканая інфляцыя больш чым у два разы перавышае яе фактычны ўзровень.

У аснове дадзеных ацэнак ляжыць перш за ўсё псіхалагічны фактар. Насельніцтва будуе свае здагадкі датычна будучай інфляцыі згодна з назіраннямі за бягучай і мінулай цэнавай дынамікай, якая на працягу доўгага часу ў мінулым характарызавалася высокімі тэмпамі. Пры гэтым людзі схільныя пераносіць рост цэн па асобных, найбольш значных для іх з пункту гледжання спажывання, таварах і паслугах на агульны рост цэн у эканоміцы.

Падтрымлівае завышаны ўзровень інфляцыйных чаканняў і незбалансаванасць публікацый у СМІ. Пры асвятленні тэмы спажывецкага рынку большасць навін канцэнтруецца вакол пазіцый, дзе цэны выраслі, выпускаючы, як правіла, з-пад увагі тавары і паслугі, цэны на якія не змяніліся або знізіліся.

Дадатковым фактарам, які перашкаджае зніжэнню інфляцыйных чаканняў, з'яўляецца таксама недасканаласць палітыкі адміністрацыйнага цэнавага рэгулявання. Частыя і нескаардынаваныя рашэнні дзяржаўных органаў аб павышэнні цэн і тарыфаў фарміруюць у насельніцтва адчуванне пастаяннага росту цэн. Пры гэтым рэгуляваныя цэны і тарыфы нярэдка павышаюцца дзяржавай на велічыню, якая перавышае ўстаноўлены мэтавы параметр па інфляцыі.

Растуць укłады ў рублях

На фоне павелічэння банкамі даходнасці па новапрыцягнутых укладах тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва ў І квартале павялічыліся на 6,7 %. У структуры дэпазітаў фізічных асоб у нацыянальнай валюце працягнулася тэндэнцыя росту долі безадзыўных укладаў, удзельная вага якіх павялічылася ў сакавіку да 56,6 %. Сярод іх галоўным чынам растуць доўгатэрміновыя ўклады, доля якіх у агульным аб'ёме безадзыўных дэпазітаў насельніцтва ў беларускіх рублях перавысіла на 1 красавіка 70 %.

У частцы валютных збераженняў варта адзначыць, што аб'ём прыцягнутых банкамі валютных сродкаў у насельніцтва за І квартал 2018 года практычна не змяніўся і склаў каля 8,4 млрд долараў. У той жа час у іх структуры расце доля пераводных дэпазітаў, адлюстроўваючы жаданне людзей мець больш ліквідныя актывы на фоне зніжэння працэнтных ставак па ўкладах у замежнай валюце. Так, тэрміновыя валютныя дэпазіты насельніцтва за І квартал знізіліся амаль на 160 млн долараў. Пры гэтым пераводныя дэпазіты выраслі на 112 млн, аблігацыі банкаў — на 28 млн і дэпазіты каштоўных металаў — на 15 млн долараў.

Вяртаючыся да дынамікі працэнтных ставак на рублёвым сегменце дэпазітнага рынку, варта адзначыць наступнае. У сакавіку сярэднія працэнтныя стаўкі па новых тэрміновых банкаўскіх укладах фізічных асоб у рублях склалі 9 працэнтаў гадавых, павялічыўшыся з пачатку года на 1,5 %. Гэта павышэнне працэнтных ставак у асноўным звязана са зніжэннем прафіцыту рублёвай ліквіднасці ў банкаўскім сектары ў цэлым і ўзнікненнем яе дэфіцыту ў асобных банкаў. Пры гэтым бягучыя стаўкі па дэпазітах, паводле ацэнак Нацыянальнага банка, знаходзяцца бліжэй да свайго «натуральнага» ўзроўню, чым тыя, якія банкі прапаноўвалі на працягу большай частцы 2017 года ва ўмовах структурнага прафіцыту ліквіднасці.

У І квартале стаўка рэфінансавання была знізжана з 11 да 10,5 працэнта гадавых. Паводле ацэнак Нацыянальнага банка, такая велічыня стаўкі на міжбанкаўскім рынку з'яўляецца «нейтральнай». Пры гэтым яе значэнні ўзровень інфляцыі адпавядае мэтаваму параметру, а ў краіне назіраецца ўстойлівы эканамічны рост. З улікам існуючай эканамічнай сітуацыі гэта азначае, што з высокай імавернасцю працэнтныя стаўкі на дэпазітным і крэдытным рынках сёлета будуць заставацца блізкія да сённяшняга ўзроўню. Пры гэтым магчымыя іх нязначныя ваганні ў той ці іншы бок у залежнасці ад існуючай на рынку кан'юнктуры.

Зніжэнне крэдытнай нагрузкі

Спецыяліст Нацбанка адзначае, што банкамі на пастаяннай аснове праводзяцца мерапрыемствы па зніжэнні крэдытнай нагрузкі крэдытаатрымальнікаў, у тым ліку шляхам зніжэння памеру працэнтнай стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах.

Сярэдняя працэнтная стаўка па ўсіх крэдытах у беларускіх рублях (без уліку льготных) з пачатку года зменшылася на 0,5 працэнтнага пункта, склаўшы ў сакавіку 12,2 працэнта гадавых. Па ўсім крэдытным партфелі ў беларускіх рублях, у тым ліку па крэдытах, выдадзеных на льготных умовах, працэнтная стаўка ў сакавіку знізілася да 8,5 працэнта гадавых.

Адзначаецца рост як рублёвага, так і валютнага крэдытавання. У большай ступені раслі рублёвыя крэдыты. За квартал яны павялічыліся на 2,8 %, у замежнай валюце ў доларавым эквіваленце — на 0,7 %. Як і ў мінулым годзе, асноўны прырост крэдытавання прыходзіцца на насельніцтва. На фоне зніжэння ў І квартале інтэнсіўнасці спажывецкага крэдытавання насельніцтва пачало больш актыўна прыцягваць крэдыты з мэтай набыцця нерухомасці.

За мінулы год павялічыўся аб'ём крэдытавання насельніцтва амаль на 27 %, у тым ліку на спажывецкія мэты — на 75 %. На думку Нацыянальнага банка, цікавасць насельніцтва да крэдытаў шмат у чым выклікана «адкладзеным попытам». Для таго каб банкі адэкватна ацэньвалі плацежаздольнасць пазычальнікаў, а крэдытаатрымальнікі больш адказна супастаўлялі свае жаданні і магчымасці, Нацыянальны банк з 1 мая ўвёў новыя інструменты для рэгулявання рознічнага крэдытавання — паказчык забяспечанасці крэдыту (для крэдытаў на нерухомасць) і паказчык пазыковай нагрузкі (для спажывецкіх крэдытаў).

Золатавалютныя рэзервы трэба зарабіць

Задача нарошчвання золатавалютных рэзерваў павінна выконвацца не за кошт устойлівага назапашвання доўгу, а за кошт уласных сродкаў, лічыць Дзмітрый Мурын. Фактычна гаворка павінна ісці аб папаўненні рэзерваў пераважна за кошт валюты, якую краіна зарабляе ў выніку сваёй знешнеэканамічнай дзейнасці.

Аднак, як ужо адзначалася, попыт з боку суб'ектаў гаспадарання на замежную валюту перавышае яе прапанову. Таму ў існуючых макраэканамічных умовах актуальнай задачай у частцы золатавалютных рэзерваў з'яўляецца паляпшэнне іх структуры за кошт зніжэння ў ёй долі пазыковых сродкаў.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Аграрны сектар

Якасны корм — смачнае малако

У Віцебскай вобласці запланавалі падчас першага ўкосу нарыхтаваць не менш за 670 тысяч тон травяных кармоў. А ўсяго — каля 1,2 мільёна тон.

Як адзначыў **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Іван ФЁДАРАЎ**, агульная плошча травянога поля на поўначы краіны перавышае 650 тысяч га. Акрамя іншага, трэба пасеяць больш за 60 тысяч гектараў кукурузы на сілас і прыблізна 34,5 тысячы гектараў аднагадовых культур.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ на пасяджэнні, дзе ў ліку іншага абмяркоўвалася пытанне нарыхтоўкі кармоў, патрабаваў вырашаць своечасова ўсе пытанні. У прыватнасці, займацца падкормкай, араць землі, дзе так званыя непрадукцыйныя травы, забяспечыць падрыхтоўку тэхнікі. Падчас нарыхтоўкі кармоў у палях будуць выкарыстоўвацца каля 640 кормаўборачных камбайнаў, прыблізна 1,3 тысячы трактарных касілак, больш за 650 прэс-падборшчыкаў і гэтак далей.

Каб, не зацягваючы, правесці якасную ўборку, механізатары будуць працаваць у дзве змены. А трамбоўка будзе весціся кругласутачна. У раёнах, дзе не хапае неабходнай тэхнікі, будуць працаваць спецыяльна створаныя міжгаспадарчыя корманарыхтоўчыя атрады.

Таксама вырашана стварыць мабільныя атрады і звенні, каб аператыўна рамантаваць тэхніку ў полі. У «падраздзяленнях» будуць працаваць найлепшыя спецыялісты, у якіх будзе транспарт і мабільная сувязь.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Віцебскай вобласці Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, які прысутнічаў на пасяджэнні, заклікаў кіраўнікоў райвыканкамаў больш актыўна дапамагаць гаспадаркам набываць угнаенні, камбінаваныя прэс-падборшчыкі з адначасовай абмоткай кармоў сеткай і плёнкай. Спікер парламента нагадаў пра даручэнне кіраўніка дзяржавы ўзводзіць сучасныя збудаванні для захоўвання кармоў. На сёння ў лідарах Глыбоцкі раён.

Спецыялісты падлічылі, што ўборку траў першага ўкосу можна правесці на працягу прыкладна двух тыдняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Калі адрамантуюць лінейныя паскаральнікі?

У Магілёве працуе састарэлае абсталяванне для лячэння анкахворых, а новае — чакае рамонту

Пацыенты аддзялення радыялогіі Магілёўскага анкадыспансера напісалі ліст у Адміністрацыю Прэзідэнта. «Наша галоўнае лячэнне — прамянёвая тэрапія, а абсталяванне зламалася і невядома калі будзе адрамантавана. Стварылася вялікая чарга, страчваецца надзея на прадаўжэнне жыцця, псуецца настрой...», — пішуць заяўнікі і просяць паскорыць рамонт тэхнікі. Пад лістом дзясяткі подпісаў.

Магілёўскі анкадыспансер мае добрую рэпутацыю. Нядаўна тут адкрыўся новы аперацыйны блок, шмат закуплена сучаснай тэхнікі, якая павінна служыць на карысць здароўя чалавека. І гэта цудоўна, бо ўсяляе надзею, што жыццё з гэтым страшным дыягназам не заканчваецца. Але ў бальніцы не ўсё такое ідэальнае, як аперацыйны блок. Зараз, напрыклад, для лячэння анкахворых застаўся адзіны прамянёвы апарат «Тэратрон», яго тут яшчэ называюць «брэжнеўскі», намякаючы на салідны ўзрост. Астатнія два сучасныя лінейныя паскаральнікі, якія ад бесперапыннай працы перыядычна выходзілі са строю, нядаўна зусім зламаліся. Здавалася б, у чым праблема? Адрамантавалі — усё тут! Але не так усё проста. Маўляў, запчасткі імпартныя і вельмі дарагія, таму нельга сказаць, калі тэхніка будзе адрамантаваная. Магчыма, праз тры месяцы, а магчыма, і праз пяць. Адным словам, калі будуць грошы.

Хацела высветліць дату, калі адрамантуюць лінейныя паскаральнікі, таму патэлефанавала на прамую тэлефонную лінію ў Магілёўскі аблвыканкам. На жаль, у лісце за подпісам **галоўнага ўрача Магілёўскага абласнога анкадыспансера Антона ЛЫСОВА** прамога адказу на пытанне не знайшла. Там паведамляецца, што пададзена заяўка на правядзенне працэдуры закупкі запчастак і пытанне з рамонтам лінейных паскаральнікаў знаходзіцца на кантролі ў Міністэрстве аховы здароўя. Але на які час працэс закупкі можа расцягнуцца?

І што гэта наогул за апараты, якія трэба рамантаваць месяцамі? Вядома, што людзей без дапамогі не пакінуць, але тут можа паўстаць пытанне аб якасці лячэння. Той жа «Тэратрон» самі спецыялісты параўноўваюць ужо з учарашнім днём. У лісце з анкадыспансеры супакоілі, што пацыентаў, якія праходзілі лячэнне на «лінейніках», размеркавалі па іншых бальніцах краіны. У Магілёўскім анкадыспансеры іх было не меней за сотню. Дзеля цікавасці патэлефанавала ў Гомельскі абласны клінічны анкадыспансер. Там паведамілі, што чарга на іх «лінейнік» такая, што жыхарам іншых абласцей не трэба нават строіць планы.

Па інфармацыі, якой падзялілася **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН**, зараз праводзяцца неабходныя мерапрыемствы па закупцы запасных частак для рамонту лінейных паскаральнікаў. Як толькі яны будуць набытыя, абслуговая арганізацыя ўстановіць іх на працягу ад дня да тыдня. Юлія Барадун таксама паведаміла, што дадзеныя апараты з'яўляюцца складаным высокатэхналагічным абсталяваннем, а таму нельга прадбачыць, што менавіта ў іх зламаецца. А купляць нешта ў запас, удакладняе яна, нерацыянальна.

Нагадаем, што лінейныя паскаральнікі ў Магілёўскім абласным анкадыспансеры не працуюць ужо другі месяц. А адзіны гама-апарат «Тэратрон» абслугоўвае пацыентаў у 4 змены.

У пацыентаў аддзялення радыялогіі асабліві позірк, вельмі цяжка глядзець ім проста ў вочы. Але чым дапамагчы? У нас бясплатная медыцына, і што дзіўнага ў тым, што рак — вельмі дарагая хвароба. Магілёўскія ўрачы — чараўнікі, але ж не настолькі. Яны не могуць стварыць з нічога абсталяванне. Радыялогія — адно з нямногіх аддзяленняў анкадыспансера, дзе адзіночныя палаты не карыстаюцца попытам. Тут лягчэй пераадольваць бяду разам. Калі што, суседзі па палаце супакояць і падтрымаюць. Страшна толькі, што хворых шмат. Тут не строяць планаў на будучыню. Галоўнае — сённяшні дзень. І гэтыя лінейныя паскаральнікі патрэбны толькі для таго, каб ён быў не апошні. Бо лекаў, паўтаруся, ад іх хваробы на апошніх стадыях няма.

Нэлі ЗІГУЛЯ

БЯСПЛАТНЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ У МІНЮСЦЕ

Знайсці адказы на свае жыллёвыя, працоўныя, сямейныя і іншыя пытанні, разабрацца ў праблемах прымусовага выканання судовых пастаноў і іншых выканаўчых дакументаў усе ахвотныя змогуць у Мінску 7 мая з 11 да 13 гадзін у Міністэрстве юстыцыі Беларусі.

Спецыялісты міністэрства разам з супрацоўнікамі Беларускай натарыяльнай палаты і Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў бясплатна пракансультуюць грамадзян па адрасе: г. Мінск, вул. Калектарная, 10.

Акцыя прымеркавана да 73-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ветэраны могуць звярнуцца па дапамогу і кансультацыю па тэлефоне 8 (017) 200 97 55 або 8 (017) 200 03 84. Папярэдне трэба пакінуць заяўку аб патрэбе атрымання прававой дапамогі. Пры неабходнасці вырашыць пэўнае пытанне спецыялісты наведаюць заяўнікаў дома.

У рэгіёнах краіны галоўныя ўпраўленні юстыцыі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама правядуць такія ж акцыі па бясплатным кансультаванні з 3 да 8 мая.

Ірына СІДАРОК.

Паветраныя змеі — у гонар Перамогі

Фестываль паветраных змеяў пад назвай «Майскае неба Перамогі» пройдзе 5 мая ў Брэсце. На пляцоўцы ў раёне тэхнічнага ўніверсітэта збяруцца больш за сто школьнікаў і навучэнцаў устаноў дадатковай адукацыі. Яны запусцяць у неба паветраных змеяў у гонар Вялікай Перамогі.

Гэта не першы фестываль паветраных змеяў у Брэсце. Але на гэты раз ён абяцае стаць найбольш масавым. Арганізатары, якімі выступілі аддзел адукацыі, спорту і турызму Брэсцкага гарвыканкама, цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, абласное ўпраўленне МНС, аб'явілі мерапрыемства адкрытым. Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя. На фэст можа прыйсці любы школьнік з бацькамі альбо таварышамі і зрабіць свайго змея на майстар-класе, які правядуць вопытныя педагогі. Для ўдзелу патрэбна толькі жаданне, матэрыяламі забяспечаць арганізатары.

Таксама запланаваны паказальныя выступленні ратавальнікаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні загадчыцы аддзела вытворчасці Кудзінай Вользе Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

МАЛАЯ РАДЗІМА ІВАНА І КАЦЯРЫНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вёска Аброва — адна з самых вялікіх у Івацэвіцкім раёне: тут пражывае болей за тысячу жыхароў.

Сёння гэта — цэнтр сельсавета, а тэрыторыя сельсавета не выходзіць за межы вёскі. Чым і ганарацца вяскоўцы. А яшчэ і тым, што вёска існуе не менш за шэсцьсот гадоў. Маўклівым сведкам даўніны застаўся дуб на старых могілках. На галінах старога дрэва сем буслянак.

Кожную раніцу буслініыя сем'і абуджаюць сваім клёкатам вясковую цішыню. Адну з такіх сонечных раніц Аброва давялося назіраць і мне.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by

Годныя ўмовы працы, быту і заробкі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы, мясцовыя, нездарма кажам: дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. У гаспадарцы працуе нямала тутэйшых хлопцаў і дзяўчат. Абзавяліся сем'ямі, хатняй гаспадаркай, гадуюць дзяцей. А самае галоўнае, што ў кожнага ёсць уласнае жыллё, — дадае Жанна Адамаўна.

— У нас, можна сказаць, жыллёвая праблема вырашана цалкам: узведзена каля 70 катэджаў сядзібнага тыпу. Спадзяёмся, што сёлета зноў трапім у Дзяржпраграму аднаўлення і развіцця сяла і плануем за кошт банкаўскіх крэдытаў пабудаваць яшчэ тры катэджы, — дзеліцца планамі **дырэктар ААТ «Лазавічы» Міхаіл АСКЕРКА.** — А гады праз два ў аграгарадок прыйдзе і газ — ужо рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя. Імкнёмся, каб у нас умовы працы, быту, пражывання былі не горшыя, чым у гарадскіх жыхароў.

Як лічыць дырэктар, у кожным населеным пункце павінны быць бездакорныя дарогі, сацыяльнае абслугоўванне, неабходныя тавары паўсядзённага попыту, якасныя прадукты харчавання і вада, доступ да сучасных інтэрнэт-рэсурсаў. Толькі так можна забяспечыць камфортнае і якаснае пражыванне сельскіх людзей. А гэта ў сваю чаргу дазволіць прыцягнуць і замацаваць кадры на вёсцы, у тым ліку і маладых спецыялістаў.

— Што трэба сучаснаму маладому чалавеку, на вашу думку, Міхаіл Пятровіч? — цікаўлюся ў кіраўніка. — Здавалася б, у аграгарадках ёсць усе неабходнае, але чамусьці многія імкнуцца ў горад.

— Вёску трэба любіць. Без гэтага пачуцця тут не прыжывешся, — лічыць суразмоўнік. — А калі палюбіш зямлю ўсёй душой, то і зусім іншыя адносіны будуць да сельскай гаспадаркі. Падчас сезонных работ даводзіцца практычна ўвесь дзень шчыраваць на палетках, без выхадных. А маладыя хочуць адпачыць. Вядома, па меры магчымасці стараемся даваць моладзі выхадныя і ў пік асноўных работ. Шмат маладых спецыялістаў прыжываюцца ў нас, бо разумеюць, што ў горадзе такога дыхтоўнага жылля за дарма не атрымаеш.

— А як наконт занятасці? Работы ў аграгарадку ўсім хапае? — пацікавілася ў мясцовых жыхароў.

— Не лянуйся, толькі працуй. Калі добры работнік, то і жыць будзеш заможна. Паглядзіце, якія прыгожыя дамы навокал. Некаторыя сем'і маюць па дзве машыны, — прагучала ў адказ.

Сапраўды, у Лазавічах практычна запоўнены штат работнікаў. Хапае механізатараў, паляводаў, спецыялістаў, аператараў машыннага даення. Даяркі маюць па дзесяць выхадных у месяц з улікам падмены і зарабляюць па 800 рублёў.

У аграгарадку вытрыманы ўсе сацыяльныя стандарты. Ёсць два магазіны, сталовая, аддзяленне банка, бібліятэка, клуб, дзіцячы сад, сярэдняя школа. Але вучыцца тут не так шмат дзяцей. Летась было толькі два першакласнікі. Таму бацькі вымушаны іх вазіць у школу суседняга аграгарадка Морач. Ды мясцовыя жыхары лічаць, што закрываць вучэбную ўстанову не варта. Няма будучыні ў населеных пунктах, дзе ліквідуюцца дзіцячыя ўстановы. Такога меркавання прытрымліваецца і Міхаіл Аскерка. Калі малыя растуць у сваім аграгарадку, то больш шанцаў, што яны тут застануцца і пасля школы або вернуцца на малую радзіму пасля заканчэння вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў.

— У нас створана ўся неабходная інфраструктура, каб людзі маглі жыць годна, — сустракае нас на сваім падворку Ганна Сомава.— Радуе, што ёсць магазіны, дзе набываем прадукты, тавары паўсядзённага попыту. А калі нечага не хапае, то можна зрабіць індывідуальны заказ і ўсё неабходнае прывязуць наступным разам. Рэгулярна да нас прыязджае аўтакрама, якая па просьбе можа спыніцца каля дамоў пажылых людзей. Гэта вельмі зручна і эканоміць час.

Ганна Іванаўна толькі нядаўна пайшла на адпачынак, да гэтага ўзначальвала жывёлагадоўчую ферму, агульны працоўны стаж жанчыны 50 гадоў.

— Вельмі добра, што ў аграгарадку ёсць фельчарска-акушэрскі пункт, — дадае яна. Урач агульнай практыкі заўсёды выслухае, прапіша неабходныя лекі. Тут можна памераць ціск, зрабіць кардыяграму, аналіз крыві, прайсці розныя працэдуры, палячыць зубы. Чым не зручна? У сваю чаргу ў амбулаторыі рэгулярна вядзе прыём і тэрапеўт з раёна.

— І ўсё ж, — звяртаюся да кіраўніка базавай гаспадаркі Міхаіла Аскеркі, — якім вы бачыце свой аграгарадок у будучым? Гарадком-садам, кветкай, сонцам?

— Якім ён будзе праз дзесяцігоддзі цяжка сказаць. Гэта залежыць ад моладзі, якая прыйдзе нам на змену. Але адназначна населены пункт будзе развівацца і прыгажэць, станавіцца больш камфортным для жыцця. Ды для гэтага трэба, на мой погляд, мяняць сістэму ўладкавання аграгарадкоў, мысленне жыхароў. Варта прыцягваць людзей, якія б рыхтавалі сваіх дзяцей, унукаў да працы ў сельскай мясцовасці. І нядрэнна, каб дзяржава выдзяляла крэдыты для будаўніцтва шыкоўнага катэджа, на закупку тэхнікі. У такім выпадку чалавек атрымае магчымасць адкрыць і развіваць сваю справу не толькі ў сельгасвытворчасці, але і ў турызме, іншых відах дзейнасці. І ў наступным пакіне набытае сваім нашчадкам, якія прадоўжаць справу.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

У аграгарадку, як у горадзе.



Ганна СОМАВА мае 50 гадоў стажу ў жывёлагадоўлі.

Фота Анатоля БАСАВА.

■ Бяспека на дарозе

ДЫПЛАМАТЫ ЗА РУЛЁМ

Роў рухавікоў, на старт, увага... Так пачынаюцца амаль усе гонкі, і, калі бачыш, як аўто эфектна дрыфціць па асфальце, уздымаючы клубы дыму, хочацца паспрабаваць так жа. Але часцей кіроўцы сустракаюцца з іншым экстрэмальным ваджэннем: калі на слізкай дарозе калёсы губляюць счапленне і машыну пачынае заносіць. Прадухіліць аварыю атрымліваецца далёка не заўсёды, бо ў аўташколах усе небяспечныя сітуацыі вывучаюцца толькі ў тэорыі, а на практыцы так лёгка разгубіцца і «злавіць» дрэва.

Удзельнікі змаглі сябе адчуць і пажарнымі: прадстаўнікі МНС паказалі інструменты, з якімі працуюць на месцах аварый.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ адзначыў, што бяспека дарожнага руху сёння з'яўляецца надзвычайна важнай праблемай не толькі ў Беларусі. Ён расказаў, што нядаўна на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН была прынята рэзалюцыя «Паляпшэнне бяспекі дарожнага руху», сааўтарам якой таксама выступіла і наша краіна. Па сутнасці, да аварыйнай сітуацыі можа прывесці і тэхнічная паломка, і сам кіроўца, які, напрыклад, палічыў, што выпіць сто грам на дарожку не пашкодзіць. Як лічыць кіраўнік знешнепалітычнага ведамства, «у канчатковым выніку ўся праблема заключаецца ў чалавечым фактары, таму трэба зыходзіць з таго, што нам неабходна вучыцца культуры ваджэння». Уладзімір Макей звярнуў увагу на тое, што, паколькі наша краіна транзітная, неабходна, каб яна асацыявалася з узорнымі паводзінамі на дарозе. Гэта імідж Беларусі, і мы ўжо дасягнулі пэўных поспехаў у гэтым кірунку. Напрыклад, як заўважыў міністр, у нас амаль ніхто не пераходзіць дарогу на чырвоны.

У Беларускім клубе аўтамотатурызму ведаюць гэтыя сітуацыі лепш за многіх, бо дапамагаюць у выпадку ДТЗ нашым і замежным грамадзянам. Гэты клуб пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў, Мінтранса і МНС арганізаваў спецыяльны выезд для дыпламатаў і іх сем'яў, дзе яны змаглі самі адчуць, як гэта — ездзіць на нявёстойлівых колах, успомнілі правілы і прыёмы першай медыцынскай дапамогі і зноў жа звярнулі ўвагу на бяспеку на дарогах. Ініцыяваў мерапрыемства **ганаровы консул Бахрэйна ў Беларусі і старшыня праўлення БКА Рафаэль МУСАЕЎ.**

Сістэма Skidcar, якая прыпадымае колы аўто.

Спадар Мусаеў расказаў, што аўтаклуб працуе ўжо больш за 20 гадоў у Беларусі. Яны аказваюць дапамогу як членам аб'яднання, так і іншаземцам. Напрыклад, калі ў ДТЗ трапіў грамадзянін іншай краіны, консульствы часта звяртаюцца да іх і арганізацыя дапамагае ў тым ліку перавезці аўто на радзіму гаспадара. «Сёння шмат дыпламатаў уступаюць у члены клуба, — гаворыць Рафаэль Мусаеў, — таму што ва ўсім свеце ёсць аўтамабільныя клубы, якія аказваюць такія паслугі. І, будучы ў сябе на радзіме, дыпламаты прывыкаюць атрымліваць іх».

Дыпламаты змаглі самі адчуць, як гэта — калі заносіць на дарозе. Трэнажорная сістэма Driftcar уяўляе з сябе красовер на колцах. Літаральна: заднія колы стаяць на спецыяльнай падстаўцы з чатырма меншымі, таму шафёр не можа кіраваць імі. Калі садзішся, пад тваёй уладай толькі пярэднія колы і ўласныя майстэрства і вопыт. Уладзімір Макей заўважыў: «Мы правільна зрабілі, што сёння праводзім гэтую акцыю. Сапраўды, калі ўзнікаюць неардынарныя сітуацыі, трэба ведаць, як паводзіць сябе. Мы дамовіліся з калегамі, якія паказваюць нам сёння правілы кіравання, што абавязкова падумаем, як арганізаваць і для дыпламатаў падобныя курсы і як патрэніравацца правілам экстрэмальнага кіравання».

Можна было сапраўды адчуць, як гэта важна — прышпільвацца: спецыяльная ўстаноўка пераварочвае машыну вакол сябе. Калі вісіш уніз галавой, сапраўды адчуваеш, што супрацiўляецца сілам гравітацыі і выратоўвае цябе ад падзення толькі гэты рамень. Яшчэ падчас акцыі валанцёры Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа прадэманстравалі, як дзейнічаць пры розных траўмах, якія можна атрымаць у ДТЗ, а супрацоўнікі МНС далі патрымаць інструменты, з якімі працуюць на месцах аварый.

«У канчатковым выніку ўся праблема заключаецца ў чалавечым фактары, таму трэба зыходзіць з таго, што нам неабходна вучыцца культуры ваджэння».

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі ў Беларусі Петэр ДЭТМАР адзначыў, што розніца ў дарожным руху нашых краін толькі ў тым, што па аўтабане можна ездзіць нашмат хутчэй. З уласнага вопыту дыпламат расказаў, што ў нашай краіне кіроўцы за горадам паводзяць сябе больш дысцыплінавана, але ў межах населеных пунктаў часам непрадказальныя. У Германіі ўсё наадварот. Адзін з галоўных момантаў у горадзе, які адзначыў Петэр Дэтмар, — выкарыстанне мабільных тэлефонаў падчас руху. Гэта вельмі небяспечна, паколькі кіроўца не можа цалкам канцэнтраваць сітуацыю на дарозе.

Надзея АНІСОВІЧ

■ Памяць

Гісторыя салдацкай каскі

Усё далей у мінулае адыходзяць гады Вялікай Айчыннай вайны, але ж для нас і, спадзяюся, для будучых пакаленняў гэта не проста гісторыя.

У лесе непадалёк ад вёскі Карніца, дзе праходзіла маё дзяцінства, ёсць адзінокая магіла. У кнізе «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць» яна згадваецца так: «...Воін (прозвішча не ўстаноўлена) загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск».

У ваколіцах Карніцы яго ведалі ўсе: сюды ў Дзень Перамогі прыходзілі ветэраны і жыхары навакольных вёсак, каб аддаць даніну павагі і памяці. Да таго ж лес абапал быў багаты на грыбы, і калі ў некага пыталі, дзе іх назбіралі, людзі адказвалі: «Каля «байца».

Гісторыю яго магілы мне расказала мая родная цётка Вольга Сяргееўна Васілеўская. Па яе словах, летам 1941-га, выходзячы з акружэння, у няроўным баі з немцамі загінула група чырвонаармейцаў. Мясцовыя пастухі пахавалі іх у дзвюх магілах: адна была брацкая, на другой яны палажылі салдацкую каску, у сярэдзіне якой было напісана: «Хлеб Пётр». (Пазней астанкі трынаццаці чырвонаармейцаў былі перапахаваныя на могілках суседняй вёскі Бараціна, а магіла з каскай так і засталася.)

Мяне зацікавіў лёс салдата з такім незвычайным прозвішчам, якое запомнілася маёй, тады шаснаццацігадовай, цёткы. Я звяртаўся да ветэранаў вайны, пісаў у рэдакцыі газет. І якое ж было здзіўленне, калі адночы — разам з сям'ёй, на «Жыгулях» — з Растова да мяне прыехаў Уладзімір Пятровіч Хлеб. Ён доўга шукаў хоць якія-небудзь звесткі пра свайго бацьку і тут...

Госць сустрэўся тады з жыхарамі Карніцы, пабываў на магіле, наведаў ваенкамат, моцна пашкадаваў, што не захавалася каска... Здавалася б, можна паставіць кропку? Бянтэжыла хіба адно: Уладзімір Пятровіч, апроч маленькай бацькавай фатаграфіі, меў паведамленне, дзе было напісана, што Хлеб Пятро Рыгоравіч знік без вестак у... 1942-м.

Больш за год мы працягвалі ўжо сумесны пошук. У выніку стала вядома, што «радавы Хлеб Пятро Рыгоравіч, 1905 года нараджэння, выхадзец з Чарнігаўскай вобласці... памёр у нямецкім палоне 14 сакавіка 1942 года». Хто ваяваў і загінуў у 1941-м каля вёскі Карніца, як туды трапіла салдацкая каска з надпісам «Хлеб Пётр», па-ранейшаму застаецца таямніцай.

...Праходзіць, пралятае час і многае мяняе. Даўно няма ўжо Карніцкай пачатковай школы, вучні якой даглядалі магілу, няма ў гэтай вёсцы жыхароў ды і яе самой няма.

Толькі помнік застаўся стаяць у ганаровай варце. Ён знаходзіцца пад патранажам Хваставіцкага сельсавета.

Валерый ВАСІЛЕЎСКІ,

г. п. Глуск

■ Адрасы міласэрнасці

Прыстанак, дзе заўсёды прымуць

Лядзенскі мужчынскі манастыр знаходзіцца ў вёсцы Малыя Ляды Смалявіцкага раёна, і ўзнік ён па боскім наканаванні: у 1730 годзе яго заснаваў мінскі ваявода Завіша ў знак падзякі за вылячэнне жонкі.

Маё першае паломніцтва ў гэты манастыр адбылося гадоў 25 таму, але светлыя дні знаходжання там і клопат аб кожным чалавеку ў памяці дагэтуль, як і шчырае жаданне жыць па-новаму.

Цяпер браты Лядзенскага манастыра падпарадкоўваюцца ігумену айцу Лаўру. Жыццё яго скіраванае на духоўнае ўдасканаленне, назапашванне вопыту, служэнне блізкім і Богу. Манах завочна вучыцца ў Жыровіцкай семінарыі. Ён цярпліва прымае абяздоленых сясцёр і братоў, пакрыўджаных несправядлівым светам. А іх, трэба сказаць, нямала, прычым розных узростаў.

Стаю побач з паслушнікам Алегам. Ён расказвае, што некалі меў і сям'ю, і працу, але дома пачаўся разлад, і жонка з пасынкам выставілі яго на вуліцу. Нейкі час Алег жыў у пад'ездзе, потым — пад адкрытым небам, на здымнай кватэры. Па прафесіі ён радыёмеханік. Тут, у манастыры, з надзеяй на ласку Усявышняга, працуе аператарам ацяпляльнага абсталявання, жыве сярод людзей з лёсамі, у нечым падобнымі да ягонага...

— Пасля смерці бацькоў, — расказвае брат Аляксандр з Брэстчыны, — мяне забралі да сябе дзядуля з бабуляй. Я скончыў школу, працаваў, паверыў у Бога і пасяліўся ў Лаўрышаўскім манастыры. Потым паехаў у Мінск, зняў пакой, уладкаваўся на работу, але плацілі там вельмі мала, і я звольніўся.

У Лядзенскім манастыры Аляксандр працуе на кухні: чысціць гародніну, пячэ хлеб, просвіры, накрывае на сталы і марыць аб шчаслівым сямейным жыцці.

На тэрыторыі абіцелі ёсць свая пякарня, свая пасека, швейная майстэрня, ферма. Нядаўна адкрылася манастырская чайная, дзе паломнікі могуць пачаставацца піражкамі з духмянай гарбатай ці кавай. У хуткім часе ў манастыры плануюць асвоіць вэнджанне рыбы, прыгатаванне рыбных кансерваў па-дамашняму.

...Задаволены насельнікі абіцелі і сваімі ўмовамі жыцця: для іх — двух- і чатырохмесныя келлі, душавыя кабінкі, адзенне, абутак, бялізна... За прытулак і ежу яны не плацяць: нясуць розныя паслушэнствы, сумяшчаюць працу з малітвамі.

Сэнс служэння праваслаўных братоў для многіх па-ранейшаму застаецца загадкай. Але Бог ведае сэрцы людзей і звяртаецца да іх са словамі: «Прыйдзіце да Мяне, я супакою вас».

Бывае, на жаль, што чалавек заблудзіцца, разгубіцца сярод мітусні і людскога непаразумення, стане шукаць дарогу... На шчасце — яна блізка: ёсць на зямлі хрысціянскія прыстанкі, дзе жыве міласэрнасць і дзе заўсёды прымуць тых, хто «распусціў маёмасць сваю», але раскаяўся: адзенуць, абуюць, накормяць і будуць шчыра прасіць Усявышняга аб дабрабыце.

Святлана НЯРОНСКАЯ,

г. Мінск

■ Весткі з месцаў

ТОЙ МОСТ НЕ ГЭТЫ...

У маштабах Беларусі новы мост цераз рэчку Дрыса, можа, і не падзея, а вось для нашай вёскі Янкавічы ды іншых жыхароў Расоншчыны — яшчэ і якая!

Канкрэтны выпадак: мінулым летам у вёску Булгакі везлі будматэрыялы. Машына даехала да моста. Перад ім кіроўца ўбачыў абмежавальны знак (пяць тон) і далей не паехаў: можна сказаць, разгрузіўся пад знакам. Далей сілікатабетонныя блокі прыйшлося перавозіць на мотаблоку...

І гэта, вядома ж, толькі адзін выпадак, бо на тым беразе ракі — жывёлагадоўчая ферма, сельгасугоддзі, землі лясной гаспадаркі, людзі. Яны не адрэзаны больш ад «вялікай зямлі».

...Трэба сказаць, што на маёй памяці гэта чацвёрты мост. Ранейшыя насцілы былі драўляныя і вельмі хутка ламаліся. Таму новае жалезабетоннае збудаванне тут вельмі дарэчы.

Аляксандр МАТОШКА,

в. Янкавічы, Расонскі раён

■ Так ці не. Практыкум

ГОГА, ЁН ЖА ГОША... АЛЕ НЕ РЫГОР!

«Дапамажыце, калі ласка: рускае *отдавать себе отчет* — гэта ў перакладзе *аддаваць справаздачу?»* — пытаецца Аляксандра Піліповіч з Мінска.

«Нядаўна мне сказалі, што слова «дадзеныя» нельга ўжываць як сінонім «звестак». Ці так гэта?» — цікавіцца Ілья, студэнт БДПУ. Ад яго ж пытанне і наконт імя *Георгій:* гэта тое ж што Рыгор, ці не?

Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.

1. У рускай мове выраз *отдавать себе отчет* — фразеалагізм, а ён не заўжды мае патрэбу ў перакладзе: у іншай мове шукаецца адпаведнік альбо іншыя словы. У гэтым выпадку падыдуць беларускія **ўсведамляць, разумець.** Такім чынам выраз *'нужно отдавать себе отчет в своих поступках'* будзе гучаць як *'трэба разумець сутнасць сваіх учынкаў'.*

2. Рускія словы *данные* (у значэнні *«інфармацыя»*) і, напрыклад, *данные (отцом деньги)* супадаюць. У беларускай мове сітуацыя іншая: у нас тое, што было атрымана кімсьці ад некага іншага — **дадзенае:** *грошы, дадзеныя бацькам, парасон, дадзены яму сябрам...*

А вось пэўныя звесткі альбо інфармацыю ў беларускай мове называюць яшчэ па-іншаму: *у бланку трэба пазначыць асабістыя* ***даныя,*** *у бухгалтэрыю трэба паведаміць пашпартныя* ***даныя.*** Як бачым, сінонімам да «звестак» будзе слова «даныя».

Падобная розніца ёсць і ў англійскай мове. У ёй слова given значыць *дадзены,* а data — даныя. Таму гаворым правільна: *банк даных, выхадныя даныя.* Але *дадзенае бацькам абяцанне, дадзеная доктарам парада.*

3. Імёны Рыгор і Георгій, безумоўна, розныя, хоць і трапілі ў беларускую мову з адной крыніцы. Першае паходзіць ад грэчаскага імя Gregorios (ад слова gregoreo — быць пільным). Другое (і таксама ад грэчаскага Georgios) утварылася ад слова georgos 'земляроб'. Такім чынам, пераймяноўваць, напрыклад, Георгія Калдуна ў Рыгора зусім не трэба.

Цікава яшчэ, што імя Георгій роднаснае з імёнамі Юрый і Ягор (але ўсе тры ў сучаснай мове, вядома ж, самастойныя).

У абарону слоў

Апошнім часам карыстальнікі беларускай мовы пачалі пазбягаць слова **паясніць.** Вядома, у нашай мове ёсць больш часта ўжывальнае *растлумачыць, вытлумачыць.* Але і *паясніць,* здаецца, нічым не правінілася. Яго ўжывалі Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Кузьма Чорны, Іван Шамякін. Ёсць яно і ў слоўніках, як і яго «сваякі»: ясны 'зразумелы', *унесці яснасць, ясней яснага.*

Калі мы вас не пераканалі і слова *паясніць* вам па-ранейшаму не падабаецца, адзначым, што лепш не замяняць яго словам *патлумачыць:* такога няма ў нарматыўных даведніках па літаратурнай мове, і гэта гаворыць не на яго карысць

■ Слоўніца

МАЙ ЦІ ТРАВЕНЬ?

Якія сакрэты адкрывае «Гістарычны слоўнік»

Нават сёння мы можам знайсці словы, якімі карысталіся Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і многія іншыя выдатныя асобы. Летась выйшаў апошні том «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», які адлюстроўвае лексіку пісьмовых помнікаў, напісаных на старабеларускай мове ў перыяд з XIV да XVIII стагоддзя ўключна. Хіба гэта праца ў 37 кнігах не сведчыць аб тым, якой багатай была наша мова, і што мы — старажытны еўрапейскі народ з шыкоўнымі моўнымі традыцыямі?

Наша мова стала чацвёртай у Еўропе (пасля чэшскай, нямецкай і італьянскай), на якой была надрукавана Біблія. На ёй была створана першая еўрапейская канстытуцыя (статут Вялікага Княства Літоўскага). З ёй, афіцыйнай у Вялікім Княстве, павінны былі лічыцца нашы суседзі, у канцылярыях Маскоўскай дзяржавы і Каралеўства Польскага мусілі паважаць старабеларускую мову і пісаць на ёй афіцыйна-дзелавыя пісьмы.

Гістарычны слоўнік уключае больш за 75 тысяч слоў, зафіксаваных у граматах, дагаворах, статутах, летапісах, хроніках, воінскіх і рыцарскіх раманах і аповесцях, мемуарных, публіцыстычных, навуковых і рэлігійных творах. І гэта, бадай што, унікальная з'ява для ўсяго славянскага свету. Так, у нашых найбліжэйшых суседзяў пакуль такая праца яшчэ не зроблена.

Ідэя стварэння падобнага даведніка ўзнікла яшчэ ў 1927 годзе, але яе пачалі рэалізоўваць толькі праз 30 гадоў. І працавала над гэтым праектам некалькі пакаленняў даследчыкаў Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа.

Да сённяшняга часу захавалася багата крыніц, толькі Літоўская метрыка налічвае больш за 600 тамоў! Навукоўцам давялося правесці ў тым ліку і пошукавую работу. Не трэба забываць, што большасць рарытэтаў сёння знаходзяцца па-за межамі нашай краіны, і беларускія вучоныя ездзілі ў Кракаў, Варшаву, Львоў, Кіеў, Санкт-Пецярбург, Маскву, Вільню, каб збіраць матэрыял для такой фундаментальнай працы. Заўважым, што ў той час, калі пачалася работа над слоўнікам (а гэта 60-я гады), ні ксеракса, ні сканера не было. Напрыклад, Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага прывезены ў Мінск у выглядзе фотакопій і мікраплёнак.

Акрамя таго, не так проста было расчытаць старадаўнія тэксты, расшыфраваць іх. Уручную ствараліся «дасье» (яно налічвае больш за мільён картак).

Наогул, у аснову слоўніка было пакладзена каля 150 старажытных кніг і рукапісаў. Напрыклад, адна з такіх крыніц — «Трыбунал абывацелям Вялікага Княства Літоўскага» — першая кніга дзелавога зместу на старабеларускай мове, створаная ў друкарні братоў Мамонічаў у 1586 годзе.

Даведнік цікавы тым, што даследчыкі стараліся паказаць, у якіх разнастайных тэкстах сустракалася пэўная адзінка, ілюстрацыйны матэрыял падбіраўся, каб максімальна перадаць ужывальнасць слова на ўсёй тэрыторыі і на на ўсім працягу функцыянавання старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы.

Гэта надзвычай важная праца будзе карысная не толькі для лінгвістаў — праз словы адлюстравана гісторыя ў 500 гадоў. У слоўніку багата інфармацыі аб сацыльна-эканамічным жыцці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Таксама праз мову можна прасачыць, якія стасункі наладжвалі нашы продкі з іншымі народамі свету. Напрыклад, даведацца, якія грашовыя сродкі выкарыстоўвалі раней нашы продкі. Так, у слоўніку сустракаюцца 22 назвы грашовых адзінак іншамоўнага паходжання, што, бясспрэчна, сведчыць аб развіцці гандлю.

Слоўнік утрымлівае і запазычаныя словы, якія ўжываліся ў старабеларускай мове. Даследаваннямі ўстаноўлена, што іх было звыш 3600 (на першым месцы — паланізмы, на другім — лацінізмы, трэцяе займалі словы нямецкага паходжання). А яшчэ слоўнік падкажа, калі гэтыя запазычаныя словы былі ўжыты ў нашых пісьмовых крыніцах. Напрыклад, слова «гандаль» упершыню зафіксавана ў 1566 годзе, «артыкул», «скарб» — у 1388, «тавар» — у 1478, «камерцыя» — у 1686, «калькулятар» — у 1689.

Некаторыя словы, якія мы ўжываем сёння, у старабеларускай мове мелі іншыя значэнні. Так, «кніжнік» — раней гэта знаўца Святога Пісання, законаў і правілаў рэлігійнай маралі. Дзеяслоў «гостити» меў значэнне гандляваць, а «госцем» — называлі іншаземнага купца і ўвогуле чалавека, які гандлюе. Слова «посадити» часта выкарыстоўвалася ў летапісах са значэннем — выбраць, прызначыць, надзяліць уладай.

Слоўнік будзе карысны даследчыкам, якія маюць справу са старымі крыніцамі, дапаможа лепш разумець творы на гістарычную тэматыку. Працаваць з даведнікам могуць і дыялектолагі, каб прасачыць сувязь паміж мовай XIV—XVIII стагоддзяў і сучаснай. Варта звярнуць увагу на гэтую працу і тым, хто цікавіцца паходжаннем назваў вёсак, гарадоў. Ды ў аснове прозвішчаў часта сустракаюцца словы, якія да нашага часу не дажылі, але вы зможаце іх знайсці ў гістарычным шматтомніку, убачыць тлумачэнні — і многае можна расшыфраваць.

— У слоўніку мы знойдзем адказы на пытанні, якія могуць нас хваляваць, — расказвае **загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа Наталля ПАЛЯШЧУК.** — Напрыклад, даведацца, хто ён, наш продак, па сацыяльным становішчы («смерд», «шляхціч»), па родзе заняткаў («залатар» — ювелір, майстар па вырабе розных рэчаў з золата, «медасытца» — той, хто робіць хмельны напітак з мёда, півавар, «скрыннік» — майстар па вырабе скрынь і скрынак). Хто наш продак па роднасці і сваяцтве? Тут вы сустрэнеце словы «братан» — сын брата, (адпаведна, «братанка, братана» — дачка брата), «дзядзькавіч» — сын дзядзькі, «уладычыч» — сын уладыкі.

Таксама мы даведаемся пра фізічныя якасці, эмоцыі людзей («немоцны», «раны», «сляпы», «рослы»), іх статус у грамадстве, стасункі з іншымі.

Да гістарычнага слоўніка трэба звярнуцца, каб вырашыць розныя практычныя пытанні. Ён пацвярджае ці абвяргае аргументы на карысць ужывання ці неўжывання таго ці іншага слова ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.Так, да гэтага часу не сціхаюць спрэчкі наконт таго, якая назва лепш — «май» ці «травень». Даследчыкамі была праведзена работа па пісьмовых помніках і вызначана, што слова «май» ужывалася вельмі шырока, яго вы знойдзеце ў метрыках Вялікага Княства Літоўскага, карыстаўся ім і Францыск Скарына. А слова «травень» зафіксавана толькі ў выданні 1653 года.

Значнай часткай тых слоў, што ўжываліся ў старабеларускай мове, людзі актыўна карыстаюцца сёння. Але некаторыя прыгожыя словы прызабылі. Наталля Вікенцьеўна прыгадала некаторыя: «лістоўня» — ёмішча для захавання лістоў; «раскошнік» — чалавек, які схільны да раскошнага жыцця; «цікавец» — дапытлівы чалавек; «важніца» — памяшканне, дзе ўзважваюць што-небудзь; «здастачыць» — быць у дастатковай колькасці; «ваеннік» — асоба, якая ўдзельнічае ў ваенным паходзе, аперацыі; «псавацель» — той, хто псуе што-небудзь. І, бясспрэчна, у гістарычным слоўніку можна знайсці багата іншых слоў, якія заслугоўваюць таго, каб іх вярнуць у сучасную літаратурную мову.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

ВЫБАР — З ЧАТЫРОХ СЕРТЫФІКАТАЎ ЦІ... З ВАСЬМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цікава, што амаль кожны год у арганізатараў ЦТ застаюцца незапатрабаваныя абітурыентамі каля тысячы сертыфікатаў. Хутчэй за ўсё, хтосьці ўдзельнічае ў ЦТ не дзеля паступлення і атрымання прафесіі, а зусім з іншымі мэтамі, напрыклад тыя ж педагогі і рэпетытары. А з мінулага года абітурыенты атрымалі яшчэ і магчымасць здачы не трох, а чатырох тэстаў, і яны ёй актыўна карысталіся. Разам з тым пашырэнне кола дысцыплін на ЦТ накладае на абітурыентаў і сур'ёзную адказнасць, таму што здача чацвёртай дысцыпліны павялічвае і рызыку дапусціць памылку з выбарам спецыяльнасці. У першую чаргу наяўнасць чацвёртага сертыфіката актуальная для тых спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на стыку галін ці прадметных абласцей.

Здача чацвёртай дысцыпліны павялічвае і рызыку дапусціць памылку з выбарам спецыяльнасці.

— Да выбару прадметаў трэба падыходзіць надзвычай прадумана яшчэ на этапе рэгістрацыі на ЦТ, — папярэджвае **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — Рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне распачалася ў краіне 2 мая. У першы дзень ва ўсе пункты рэгістрацыі (а іх па краіне налічваецца 41) прыйшлі 2200 чалавек. Абітурыентаў чакаюць там па 1 чэрвеня ўключна, але я б не раіў адкладваць важную справу на апошні дзень, каб застаўся час на вырашэнне нейкіх праблемных сітуацый. Абавязкова трэба пераканацца, што тэрмін дзеяння пашпарта не скончыцца ў момант правядзення ЦТ ці напярэдадні, бо ў такім выпадку трапіць на ЦТ нават з аформленым пропускам будзе немагчыма. У выпадку страты дакумента, які сведчыць асобу абітурыента (пашпарта, віда на жыхарства або пасведчання бежанца), адзіны дакумент, які можа іх замяніць, — гэта даведка формы № 9, якая выдаецца органамі МУС.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў краіне 12 чэрвеня. **А 15 чэрвеня распачынаецца прыёмная кампанія ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.** На ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 31 тысячу чалавек (з базавай і агульнай сярэдняй адукацыяй), з іх 29 тысяч будуць атрымліваць прафесію на дзённай форме навучання і дзве тысячы — на завочнай і вячэрняй формах. Гэта крыху больш, чым летась. Павелічэнне набору адбудзецца па профілях: «тэхніка і тэхналогіі», «архітэктура і будаўніцтва», «грамадскае харчаванне» і «бытавое абслугоўванне».

Прыём дакументаў у ССНУ распачнецца 20 ліпеня. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі лічбы прыёму ў адносінах да папярэдняга года таксама крыху павялічыліся. Усяго плануецца прыняць больш за 39 тысяч чалавек, у тым ліку 24,5 тысячы — за кошт сродкаў бюджэту. Павялічаны аб'ёмы падрыхтоўкі па такіх профілях, як «ахова здароўя» (на 2 %), «тэхніка і тэхналогіі» (на 9 %). Пры гэтым адбылося скарачэнне прыёму на спецыяльнасці профілю падрыхтоўкі «камунікацыі, права, эканоміка» (больш чым на 10 %). На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўведзена новая спецыяльнасць — «захоўванне і перапрацоўка збожжа» — у Маладзечанскім дзяржаўным політэхнічным каледжы.

А вось колькасць месцаў для атрымання вышэйшай адукацыі ў гэтым годзе паменшылася. Прыкладна на 10 % скараціўся набор на юрыдычныя і эканамічныя спецыяльнасці. Адначасова павялічаны прыём на тэхнічныя і тэхніка-тэхналагічныя спецыяльнасці. Напрыклад, закладзены значны рост на спецыяльнасці ІТ-профілю, дзе набор павялічваецца больш чым на 400 месцаў. Адпаведныя кадры запатрабаваны эканомікай...

«Усяго на першую ступень навучання плануецца прыняць каля 54,5 тысячы чалавек, у тым ліку за кошт бюджэту — 26,5 тысячы, — удакладніў Вадзім Богуш. — Ажыццяўляць набор будзе 51 установа вышэйшай адукацыі, з якіх 42 — дзяржаўнай формы ўласнасці і 9 прыватных. Скарачэнне аб'ёму падрыхтоўкі адбылося пераважна за кошт памяншэння лічбаў прыёму на завочную форму (поўны тэрмін навучання). Пры гэтым мы даём магчымасць абітурыентам, якія скончылі ўстанову сярэдняй спецыяльнай адукацыі і пайшлі працаваць па спецыяльнасці, на падставе ўступных выпрабаванняў працягнуць навучанне ў завочнай форме ў скарочаных тэрміны па інтэграваных вучэбных планах і праграмах».

Прыёмныя камісіі ВНУ распачнуць прыём дакументаў 12 ліпеня. Да 17 ліпеня з выбарам спецыяльнасці павінны вызначыцца ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 па 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

А з 18 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

Амаль кожны год у арганізатараў ЦТ застаюцца незапатрабаваныя абітурыентамі каля тысячы сертыфікатаў.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў з 26 па 28 ліпеня (залічэнне па 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 30 па 31 ліпеня (залічэнне па 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — з 30 ліпеня па 1 жніўня (залічэнне па 3 жніўня).

Між іншым, летась незапоўненымі па ўсіх ВНУ засталося ўсяго сем бюджэтных месцаў на дзённай форме навучання і 16 месцаў — на завочнай. Таму ў Міністэрстве адукацыі лічаць, што неабходнасць у правядзенні дадатковага набору хутка ўвогуле знікне...

Традыцыйна з 1 чэрвеня ў міністэрстве пачне працаваць гарачая лінія для абітурыентаў. З пытаннямі па правядзенні ўступнай кампаніі можна будзе звярнуцца па тэлефоне (8 017) 222 43 12 і атрымаць кваліфікаваны адказ ад спецыяліста з першых вуснаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Гомельская вобласць, Светлагорскі раён

ЯК УМАЦАВАЦЬ ПРЭСТЫЖ РАЁНА?

Адказ на гэтае пытанне мы знайшлі ў Светлагорскім раёне Гомельшчыны

Летась па выніках Рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры» ў намінацыі «Найлепшы горад раённага падпарадкавання» пераможцам прызнаны Светлагорск. У Год малой радзімы тут таксама ажыццяўляецца маштабная работа па добраўпарадкаванні не толькі райцэнтра, але і сельскіх населеных пунктаў.

Старшыня Светлагорскага райвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ адзначае, што сёлета важна не дапусціць зніжэння дасягнутых вынікаў і ў аграпрамысловым комплексе, а таксама стварыць спрыяльныя ўмовы для адкрыцця новых прадпрыемстваў.

— У нас атрымалася летась захаваць станоўчую дынаміку самых важных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечыць выкананне прагнозных паказчыкаў па экспарце тавараў, вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, па ўводзе ў дзеянне жылых дамоў. У 2017-м з'явіліся 26 новых арганізацый, у тым ліку 11 — у вытворчай сферы. Зарэгістравана 236 індывідуальных прадпрымальнікаў. На суму больш за 400 млн рублёў выраблена прамысловай прадукцыі. Аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў фактычных цэнах павялічыліся на 11 %.

— Якія інвестыцыйныя праекты рэалізоўваюцца прамысловымі прадпрыемствамі раёна?

— У адкрытым акцыянерным таварыстве «Светлагорскхімвалакно» ўжо створана больш за сорак новых працоўных месцаў. Там уведзена ў эксплуатацыю ўстаноўка па рэгенерацыі адходаў ацэтону, пашырана вытворчасць мяккіх разавых кантэйнераў тыпу «біг-бег», у стадыі рэалізацыі праект «Пашырэнне вытворчасці нятканых матэрыялаў будаўнічага прызначэння». У адкрытым акцыянерным таварыстве «Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат» завяршаецца рэалізацыя праекта «Будаўніцтва завода па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы» магутнасцю 400 тысяч тон у год. Увогуле ж летась за кошт стварэння новай вытворчасці з'явілася 67 новых працоўных месцаў. Прадпрыемствы раёна выходзяць на новыя рынкі. Дзевяць краін у 2017 годзе сталі партнёрамі па знешнеэканамічнай дзейнасці. У іх ліку Азербайджан, Сербія, Кіпр, Македонія. У раўнанні з 2016 годам у раёне павялічыўся экспарт турыстычных, будаўнічых, дзелавых паслуг, а таксама паслуг аховы здароўя.

Вятрак — галоўная выдатнасць сядзібы «Міколін Востраў». 27-метровы млын быў пабудаваны ў XIX стагоддзі і з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю нашай краіны.

— Якія тэндэнцыі назіраюцца ў сельскай гаспадарцы?

— На ўзроўні больш чым 105 % тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі ў грамадскім сектары, вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і раслінаводства. У гаспадарках Светлагоршчыны праведзена значная работа па абнаўленні тэхнічнай базы і рэканструкцыі жывёлагадоўчых аб'ектаў. Летась працаўнікамі вёскі выраблена 55 тысяч тон малака, вырашчана амаль 16 тысяч тон прадукцыі раслінаводства.

— Якім чынам жыхары горада і раёна адчуваюць тыя змены, якія адбываюцца ў вытворчым сектары?

— У эксплуатацыю ўведзена 45 індывідуальных жылых дамоў. Пабудавана 17 тысяч квадратных метраў жылля ў шматкватэрных дамах. Больш як восемдзесят сем'яў адсвяткавалі ўваходзіны. Добраўпарадкаваны дарогі і гарадскія вуліцы, пастаянна ажыццяўляецца капітальны рамонт жыллёвага фонду. Адкрыліся 23 новыя крамы. Палепшылася якасць аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ўстановамі аховы здароўя раёна.

— Дзмітрый Вадзімавіч, раскажыце пра дасягненні маладых жыхароў Светлагоршчыны.

— За мінулы год у скарбонцы перамог нашых школьнікаў і навучэнцаў — 82 дыпломы абласной і рэспубліканскай алімпіяд. 90 дыпломаў яны атрымалі ў інтэрнэт-віктарынах, інтэрнэт-алімпіядах, інтэлектуальных конкурсах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. 615 прызавых месцаў заваявалі нашы спартсмены ў спаборніцтвах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. У аснове ўсіх дасягненняў — вынік добрасумленнай працы і высокай ступені адказнасці за даручаную справу кожнага, хто памножыў поспехі раёна. Нас усіх аб'ядноўвае тое, што сваю плённую працу, веды і энергію мы накіроўваем на ўмацаванне прэстыжу Светлагорскага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Помнік Раману Шацілу, легендарнаму заснавальніку Шацілак, знаходзіцца на галоўнай плошчы горада, які стаіць на беразе ракі Бярэзіны. На старонкі пісьмовых крыніц селішча трапіла яшчэ ў XVI стагоддзі. Між тым гісторыкі лічаць, што з VI—VII стагоддзя дакладна можна казаць пра існаванне жыцця на гэтай тэрыторыі. У 1961 годзе Шацілкі перайменавалі ў Светлагорск.

Скульптурная кампазіцыя «Звон» — брацкая магіла савецкіх воінаў, якая знаходзіцца ў Светлагорску на скрыжаванні вуліц Савецкай і Сацыялістычнай. На гэтым месцы былі перапахаваны 257 воінаў, якія загінулі ў баях пры вызваленні вёскі Шацілкі і тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Рака Бярэзіна.

*** Сіняе возера знаходзіцца за 16 км ад Светлагорска, каля вёскі Пагонцы. Вада ў возеры насычана серавадародам і мае паніжаную кіслотнасць. З-за гэтага флора і фаўна вельмі бедныя. У народзе возера часцей завуць Мёртвым. Жыхары расказваюць, што яно нібыта з'явілася на месцы вёскі, якая сышла на дно разам з царквой. Раней, кажуць, там мылі бялізну, як у пральні: «мёртвая» вада яе адбельвала.**

Памятны знак «Баграціён» адкрыты ў юбілейны год 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя «Баграціён» — самая ўдалая летняя ваенная аперацыя Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне. На тэрыторыі мемарыяла знаходзіцца музей, а таксама бліндажы і фрагменты ваенна-інжынерных перапраў, узоры баявой тэхнікі і ўзбраенняў.

ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ СВЕТЛАГОРШЧЫНЫ

14-гадовая Ганна Севярын, спартсменка са Светлагорска, адна з чатырох беларусак, хто будзе прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне. Дзяўчынка займаецца ў ДЮСШ № 1 і выступіць на Сусветнай гімназіядзе школьнікаў, якая пройдзе з 2 да 9 мая ў Марока.

***

Светлагорская спартсменка Аліна Гвоздзь зусім нядаўна стала чэмпіёнкай Рэспублікі Беларусь па тэквандо сярод дарослых. У спаборніцтвах прыняло ўдзел каля ста спартсменаў 2001 года нараджэння і старэйшыя.

***

Выпускніца Светлагорскай школы мастацтваў Ксенія Міхальчанка скарыла IV Міжнародны фестываль-конкурс «Новыя вяршыні — 2018».

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРЫНОСІЦЬ ПЛЁН

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў актыўна супрацоўнічае з прыходам храма Велікамучаніцы Варвары аграгарадка Баравікі, што пад Светлагорскам.

У Год малой радзімы тут пабываў зямляк, прафесар установы Уладзімір Зінкевіч. Супрацоўніцтва пачалося з арганізацыі ў Баравіках выставы сусветных шэдэўраў — спісаў абразоў Феафана Грэка, Андрэя Рублёва, Дзіянісія. Іх стваралі студэнты акадэміі ў старажытных расійскіх храмах. Цяпер студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па прапанове архімандрыта Аляксія (Жалянка) прыступілі да работы над здымкамі дакументальнага фільма, прысвечанага трагічнаму лёсу вёскі Ала Светлагорскага раёна. Каля дзвюх тысяч яе жыхароў у 1944 годзе былі знішчаны фашыстамі. Таксама кіраўніцтва Беларускай акадэміі мастацтваў прапануе правядзенне ў Баравіках рэспубліканскага мастацкага пленэру.

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ЦЯПЕР ПРАЦУЕ І НА ЭКСПАРТ

Светлагорскае райспажыўтаварыства — шматгаліновая арганізацыя, якая займаецца гандлёвай, нарыхтоўчай, вытворчай дзейнасцю, аказаннем розных паслуг насельніцтву. Яго калектыў паспяхова выконвае вельмі важную сацыяльную функцыю: забяспечвае гандлёвае абслугоўванне сельскіх жыхароў, закупляе ў іх лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны, арганізуе перапрацоўку і пастаўку ў рознічную сетку.

Старшыня праўлення Алена Лапцева

63 стацыянарныя крамы гандлёвай плошчай звыш 6600 кв. м абслугоўваюць 16 тысяч чалавек. Пяць аўтакрам тры разы на тыдзень прывозяць тавары жыхарам малых населеных пунктаў. У структуры Светлагорскага райспажыўтаварыства працуюць 32 стацыянарныя прадпрыемствы грамадскага харчавання на 1622 пасадачныя месцы.

За мінулы год аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі склаў 3230 тыс. руб., а тэмп росту ў супастаўных цэнах 110,7 %. Для забойнага цэха закупляецца жывёла ў мясцовага насельніцтва і сельгасвытворцаў. У цэху па вытворчасці мясных паўфабрыкатаў іх вырабляюць у месяц каля 40 тон. Пякарня прапануе больш за 30 найменняў хлебабулачных вырабаў.

Нарыхтоўчая галіна з'яўляецца толькі часткай эканамічнага патэнцыялу спажывецкай кааперацыі раёна. Яе дзейнасць накіравана на павелічэнне аб'ёмаў закупаў сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны ў асабістых гаспадарках жыхароў сяла, чым спрыяе росту прыбыткаў вяскоўцаў.

Аб'ём закупу сельскагаспадарчай прадукцыі летась склаў 5155 тыс. руб., што забяспечыла першае месца па аблспажыўсаюзе. Нарыхтавана мяса 777 тон, што на 245 тон больш, чым у 2016 годзе, гародніны — 277 тон, чарніц — 34 тоны (яе, дарэчы, замарожваюць і адпраўляюць на экспарт). Акрамя таго, сабралі ў насельніцтва 1023 тоны макулатуры — гэта ў 1,5 раза больш, чым у 2016-м. Лому чорных металаў — 5990 тон, шклабою — 280 тон, поліэтылену — 77 тон.

Па выніках 2017 года Светлагорскае райспажыўтаварыства выканала пяць з шасці прагнозных паказчыкаў, зацверджаных аблспажыўсаюзам: забяспечыла рост тавараабароту грамадскага харчавання, аб'ёму закупу сельгаспрадукцыі і сыравіны, аб'ёму вытворчасці прамысловай прадукцыі, экспарту, захавала добры паказчык па энергазберажэнні. Упершыню ў гісторыі Светлагорскага райспажыўтаварыства знешнеэканамічны абарот склаў больш за адзін мільён долараў. Ад гэтай дзейнасці светлагорскія кааператары атрымалі звыш 373 тыс. руб. валавых прыбыткаў.

Узорным гандлёвым аб'ектам Светлагорскага райспажыўтаварыства з'яўляецца ўніверсам «Кастрычніцкі». У ім размешчаны аддзел «Мясная лаўка», дзе можна купіць незвычайныя прадукты: мяса труса, індычкі, дыетычную бараніну і іншае. У кандытарскім аддзеле прадстаўлена смачная свежая прадукцыя ўласнай вытворчасці і тавары айчынных вытворцаў. Тавары з крамы можна набыць і праз інтэрнэт.

У маладзёжным мікрараёне размешчана крама «Жамчужына Палесся», дзе рэалізуюцца прамысловыя тавары. Тут можна купіць канцтавары, цацкі, посуд, гаспадарчыя тавары, парфумерна-касметычныя тавары, швейныя вырабы ўласнай вытворчасці, бялізнавы трыкатаж, панчошна-шкарпэткавыя вырабы і іншае.

Летась праўленнем Белкаапсаюза і прэзідыума рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў спажывецкай кааперацыі праўленню райспажыўтаварыства прысуджаны «Ганаровы знак» у намінацыі «За высокія дасягненні ў нарыхтоўчай дзейнасці» па выніках працы за 2016 год.

Пастановай праўлення Гомельскага аблспажыўсаюза і прэзідыума абкама прафсаюза работнікаў спажыўкааперацыі прысуджаны дыплом за першае месца — за дасягненне найлепшых паказчыкаў у фінансава-гаспадарчай дзейнасці за 2016 год.

УНП 400019934

ВЫКЛЮЧНАЯ ЯКАСЦЬ

Рашэнне аб утварэнні Светлагорскага завода жалезабетонных вырабаў і канструкцый было прынята 1 студзеня 1959 года, і на працягу ўсяго часу завод адрозніваўся выключнай якасцю сваіх вырабаў. Распрацаваныя спецыялістамі канструкцыі ў сукупнасці з найноўшым абсталяваннем заявілі пра Светлагорскі завод ЖБВіК як пра моцнага канкурэнта на рынку постсавецкай прасторы. Сёння больш за 80 % сваёй прадукцыі ў вартасным выражэнні завод адгружае за мяжу, пастаянна супрацоўнічае з такімі краінамі, як Расія, Літва, Латвія, Эстонія і Азербайджан.

Усяго завод выпускае каля 400 марак і 200 тыпаразмераў вырабаў з жалезабетону. Праводзячы сумесную работу са спецыялістамі праектных і навукова-даследчых арганізацый, сярод якіх «Сельэнергасеткапраект» (г. Масква), «Энергасеткапраект» (г. Санкт-Пецярбург), БНТУ (г. Мінск), Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый вядзе прадуктыўную работу па праектаванні і стварэнні новых відаў прадукцыі, такіх як жалезабетонныя пліты ПАГ для ўстройства зборных аэрадромных пакрыццяў, цэнтрыфугіраваныя апоры канатнага арміравання. Цяпер у Беларусі вядзецца актыўнае ўкараненне сістэм забеспячэння бяспекі пры арганізацыі дарожнага руху. Для выканання гэтых задач на прадпрыемстве арганізавана вытворчасць жалезабетонных блокаў утрымальных агароджаў, прызначаных для ўстаноўкі на абочыне аўтамабільных дарог, на цэнтральнай раздзяляльнай паласе аўтамабільных дарог, маставых збудаванняў і тунэляў.

Важнай падзеяй у вытворчай дзейнасці завода з'яўляецца пастаноўка на вытворчасць секцыянаваных стоек СК па спецыяльна распрацаванай Маскоўскім праектным інстытутам серыі рабочых чарцяжоў і тэхнічных умоў. Для вытворчасці гэтых стоек СК прадпрыемствам атрыманы Еўразійскі патэнт.

Вялікая ўвага ўдзяляецца і сацыяльна-бытавому аснашчэнню завода. Для работнікаў, гараджан і гасцей горада функцыянуе сталовая, кафетэрый, банкетная зала, інтэрнат і гасцініца. З нядаўняга часу ўведзены ў дзеянне сучасны лазнева-аздараўленчы комплекс.

Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый — гэта сучасны комплекс па вытворчасці жалезабетонных вырабаў і канструкцый, які мае магутную вытворча-тэхнічную базу, дасведчаных спецыялістаў, гатовых выпускаць вырабы, якасць якіх прызнана не толькі на беларускім, але і на замежным рынку.

УНП 40005115

ААТ «СВЕТЛАГОРСКІ ЗАВОД ЖБВіК»

ААТ «БУДАЎНІЧЫ ТРЭСТ № 20» — ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І ДАСКАНАЛАСЦЬ

ААТ «Будаўнічы трэст № 20» — адно з вядучых будаўнічых прадпрыемстваў г. Светлагорска і Гомельскай вобласці.

Асноўныя паслугі і віды дзейнасці: комплекс агульнабудаўнічых работ, мантаж інжынерных сетак, вытворчасць жалезабетонных і бетонных канструкцый і вырабаў на падставе атэстата адпаведнасці 1-й катэгорыі на права ажыццяўлення функцый генпадрадчыка, на права ажыццяўлення будаўніцтва аб'ектаў I—IV класа складанасці.

Генеральны дырэктар Віталь ДРЫК.

Горад Светлагорск, а таксама многія іншыя населеныя месцы Беларусі сваім сённяшнім сучасным абліччам шмат у чым абавязаны калектыву ААТ «Будаўнічы трэст № 20», які на працягу 55 гадоў годна выконвае сваё галоўнае прызначэнне: вядзе капітальнае будаўніцтва, узводзіць аб'екты сацыяльнага, прамысловага, жылога прызначэння, камунальнай інфраструктуры.

За плячыма калектыву — велізарны прафесійны вопыт, мноства збудаваных аб'ектаў. Запамінальны почырк будтрэстаўцаў можна ўбачыць на многіх жыццёва важных для Светлагорска і рэспублікі ў цэлым аб'ектах: ВА «Хімвалакно», аўтакамбінат № 3, аўтобусны парк № 5, хлебазавод, масласырзавод, агароднінная фабрыка і птушкафабрыка, турбінны цэх і вытворчасць цэлюлозы ў ААТ «Светлагорскі ЦКК», вакзальны комплекс, паветраапорнае збудаванне для тэнісных кортаў.

Спецыялісты прадпрыемства прымалі ўдзел у рэканструкцыі аб'ектаў вытворчага аб'яднання «Беларуснафта», узвядзенні будынкаў і збудаванняў РУН «Гомельэнерга», малочна-таварных ферм у населеных пунктах Міхайлаўка, Асташкавічы і Дуброва, Палессе, многіх іншых аб'ектаў. ААТ «Будаўнічы трэст № 20» прымаў удзел у рэалізацыі інвестыцыйнага праекта будаўніцтва другой тэхналагічнай лініі па вытворчасці цэменту сухім спосабам на ВРУП «БЦЗ» і ВРУП «Крычаўцэментношыфер».

У рамках рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Будаўніцтва завода па вытворчасці беленай цэлюлозы» на падставе Указа Прэзідэнта РБ № 391, ААТ «Будаўнічы трэст № 20» па дамове падраду з ААТ «Кітайская карпарацыя інжынірынгу CAMC» па заданні міністэрства архітэктуры і будаўніцтва з красавіка 2013 года па сакавік 2014-га ААТ «Будаўнічы трэст № 20» прымаў удзел у будаўніцтве аб'ектаў Алімпійскага Сочы. Будаўніцтва мемарыяльнага комплексу ў гонар буйнамаштабнай наступальнай аперацыі «Багратыён» у вёсцы Ракавічы Светлагорскага раёна.

Сёння ААТ «Будаўнічы трэст № 20» — шматпрофільнае прадпрыемства, у склад якога ўваходзяць тры падраздзялення: агульнабудаўнічае генпадраднае ўпраўленне, упраўленне механізацыі спецыялізаваных работ і завод жалезабетонных вырабаў.

Варта адзначыць, што за апошнія гады структура работ

трэста істотна змянілася: асноўны ўхіл робіцца на будаўніцтва шматкватэрнага жылля, інжынерных сетак і рэканструкцыю будынкаў і збудаванняў.

Калектыў трэста, сёння гэта 450 чалавек, заўсёды ідзе ў нагу з часам, асвойвае новыя тэхналогіі і сучасныя канструктыўныя схемы ў жыллёвым будаўніцтве. Так, апошнія 10 гадоў арганізацыя вядзе будаўніцтва па схеме «шырокі крок», асвоіла тэхналогію зборна-маналітнага домабудавання.

Жылыя дамы, іншыя будынкі і збудаванні, узведзеныя трэстам, адрозніваюцца разнастайнасцю архітэктурна-планіровачных рашэнняў, выразнасцю, дыхтоўнасцю.

Не застаецца за «кадрам» і такое важнае сёння пытанне, як энергаэфектыўнасць. выконваюцца дахавыя работы з бітумнапалімерных наплаўняльных матэрыялаў, цэментава-пяшчанай чарапіцы, металадахоўкі, прылада святлопразрыстых кровель з прафіліраваных пакрыццяў ПВХ і поліэстэру, полікарбанату. Уцяпленне фасадаў выконваецца па розных тэхналогіях, уключаючы навясныя вентыляваныя фасады. Пры аздабленні памяшканняў выкарыстоўваюцца высакаякасныя дэкаратыўныя тынкоўкі. Маецца вопыт прылады падвесных столяў з ужываннем гукапаглынальных, алюмініевых рэечных, гіпсакартонных сістэм, а таксама вакуумаваных, мазаічных, наліўных падлог і падлог з сталефібрабетонаў. Увогуле, усе работы прадпрыемству па плячы, а якасць іх выканання з'яўляецца справай прафесійнага гонару.

Зараз трэстам узводзяцца два жылыя дамы: 10-павярховы энергаэфектыўны жылы дом у Рэчыцы, 30-кватэрны жылы дом у г. п. Кастрычніцкі, здача якіх у эксплуатацыю запланавана на май—ліпень. На завяршальным этапе будаўніцтва аб'екта «Рэканструкцыя цэха пад вытворчасць сыроў на Светлагорскім філіяле ПУП «Калінкавіцкі малочны камбінат». Трэстам вядуцца будаўніча-мантажныя работы па ўзвядзенні аб'екта «Пашырэнне вытворчасці нятканых матэрыялаў будаўнічага прызначэння на ААТ «СветлагорскХімвалакно». У маі — пачатак работ па будаўніцтве аб'ектаў: «Будаўніцтва пяці сіласных траншэй у населеным пункце Хутар Светлагорскага раёна», «Рэканструкцыя ўчастка пашыву швейных вырабаў філіяла «Зарэчча» дзяржаўнага прадпрыемства № 4 з павелічэннем вытворчай магутнасці ў гарпасёлку Зарэчча Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці». У перспектыве сёлета мяркуецца будаўніцтва 72-кватэрнага жылога дома ў мікрараёне № 8 г. Светлагорска, 30-кватэрнага жылога дома ў населеным пункце Мядкоў Светлагорскага раёна, рэканструкцыя дзвюх МТФ у Светлагорскім раёне, 40-кватэрнага жылога дома ў гарпасёлку Кастрычніцкі.

Сёння ААТ «Будаўнічы трэст № 20» — адказны, надзейны партнёр на рынку будаўнічых паслуг.

УНП 400005263.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 5 июня 2018 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже предприятия как имущественного комплекса, принадлежащего открытому акционерному обществу «Коминтерн» на праве собственности и находящегося на праве хозяйственного ведения у производственно-торгового унитарного предприятия «Речицкая швейная фабрика»

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)	Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)
1	Предприятие как имущественный комплекс, **регистрационный номер 0001401,** свидетельство о государственной регистрации **№ 3337** выдано открытому акционерному обществу «Коминтерн» 09.02.2018 г.	Предприятие как имущественный комплекс создано на базе производственно-торгового унитарного предприятия «Речицкая швейная фабрика» (унитарное предприятие «Речицкая швейная фабрика»), местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Луначарского, 39. Имущество и имущественные права, входящие в состав предприятия как имущественного комплекса, согласно перечню на 31.10.2017 г.: – основные средства 58 единиц (в т. ч. 4 навеса, производственное здание с 11 изолированными помещениями, бензохранилище, 2 здания складских помещений, здание гаражей, здание мехмастерской, туалет надворный, водопроводная сеть, канализационная бытовая сеть, теплоснабжение наземное, прочие основные средства в количестве 33 единицы); – денежные средства; – долги (обязательства); – права требования; – товарно-материальные ценности. Части зданий и изолированных помещений обременены договорами аренды, последний сроком по 02.10.2021 г., общая арендуемая площадь 1 218,23 кв. м	626 919,35	30 000,00

Для обслуживания зданий и сооружений, входящих в состав предприятия как имущественного комплекса, выделен земельный участок на праве постоянного пользования площадью 0,7067 га. с кадастровым номером 324550100001000063. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 4 июня 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления, заключившие с Организатором торгов соглашение, получившие билеты участников аукциона и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **5 июня 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

К заявлению на участие в аукционе прилагаются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, с предъявлением оригинала для заверения его копии организатором аукциона; юридическим лицом – копию учредительных документов с предъявлением оригинала для заверения его копии организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть датирована не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством). В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 5 мая 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1,5 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента подписания протокола аукциона

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: ОАО «Коминтерн», г. Гомель, ул. Интернациональная, 5.
8 (029) 172-20-88; 8 (044) 721-66-49.

Извещение о проведении 5 июня 2018 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении производственного унитарного предприятия «Промышленная база ФАНИПОЛЬ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
«Здание ДОЦ (главный корпус)» общей площадью 1725,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39848; «Здание ДОЦ (фанеровка)» общей площадью 796,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39549; «Здание камеры сушильной» общей площадью 41 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39741; «Навес пилорамы» общей площадью 626,5 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39851; «Трансформаторная подстанция» общей площадью 40,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39742; «Здание проходной» общей площадью 16,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39744; «Здание административно-бытового корпуса» общей площадью 588,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39743; «Арматурно-формовочный корпус» общей площадью 2340,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-26083; «Здание РМЦ и ЖБИ» общей площадью 1349,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-21110; «Здание отделения гашения извести» общей площадью 49,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-26066; «Здание склада пиломатериалов» общей площадью 244,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-26061; «Здание АБК» общей площадью 695,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-21109; «Трансформаторная подстанция» общей площадью 100 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-26065; «Арочный склад» общей площадью 434,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-26064; «Навес железобетонный открытый» общей площадью 214 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 620/С-39884; «Здание вспомогательное неустановленного назначения № 1» с инв. № бухг. 1000456; «Здание вспомогательное неустановленного назначения № 2» с инв. № бухг. 1000457; «Эстакада подачи пиловочника» с инв. № бухг. 00020024; «Эстакада подачи пиловочника – 1» с инв. № бухг. 20212001; «Эстакада подачи пиловочника – 2» с инв. № бухг. 202120024; «Эстакада металлическая № 1» с инв. № бухг. 2021302; «Эстакада металлическая № 2» с инв. № бухг. 2021304; «Подъездные ж/д пути предприятия» с инв. № бухг. 20218001; «Внутризаводские дороги» с инв. № бухг. 00020032; «Навес для дерев. готовой продукции» с инв. № бухг. 41719072; «Навес над приемником для разгрузки сыпучих материалов» с инв. № бухг. 48021061; «Навес для дров» с инв. № бухг. 48021057; «Навес для дров цеха ПВХ» с инв. № бухг. 48021058; «Сарай для брикета» с инв. № бухг. 48021059; «Ограждение железобетонное» с инв. № бухг. 2035201; «Ограждение металлическое (сетка-рабица)» с инв. № бухг. 2035401; «Комплекс силосов для цемента (6 силосов. лестница)» с инв. № бухг. 48021062; «Устройство приемника для разгрузки сыпучих материалов» с инв. № бухг. 48021063; «Система наружного освещения» с инв. № бухг. 2080801; «Силовой трансформатор» с инв. № бухг. 00004017; «Вентиляционная система ПВХ» с инв. № бухг. 48021036; «Кондиционер» с инв. № бухг. 00008154; «Сплит система настенного типа EACS-07HQ\ N3 – 1» с инв. № бухг. 00008169; «Сплит система настенного типа EACS-07HQ\ N3 – 2» с инв. № бухг. 00008170; «Сплит система настенного типа EACS-07HQ\ N3 – 3» с инв. № бухг. 00008171; «Сплит система настенного типа EACS-07HQ\ N3 – 4» с инв. № бухг. 00008172; «Котел отопления КСО-КР-25 Оптима комфорт плюс 25 kw» с инв. № бухг. 48021039; «Котел отопления КСО-КР-35 Оптима комфорт плюс 35 kw» с инв. № бухг. 48021038; «Оборудование котельной – топочной АБК» с инв. № бухг. 48021043; «Отопительное оборудование цеха ПВХ» с инв. № бухг. 48021044; «Рама лесопильная Р-63» с инв. № бухг. 00006037; «Ворота металлические № 1» с инв. № бухг. 4802847; «Ворота откатные» с инв. № бухг. 48021047; «Автоматическая установка пожарной сигнализации» с с инв. № бухг. 47000001; «Тревожная сигнализация» с инв. № бухг. 48021012; «Козловой кран КККТК-12,6» с инв. № бухг. 41702010; «Кран мостовой г. п. 10 т» с инв. № бухг.41708009; «Вентиляционная система помещений производства мыла» с инв. № бухг. 41600037; «Котел КУ-11-64 Немига» с инв. № бухг. 44132045; «Котлоагрегат (пресс)» с инв. № бухг. 44132046; «Расширение котельной» с инв. № бухг. 44132047
Местонахождение – Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 29В, 29В/2, 29Г, 29В/1, 29Д/1, 29Ж/1, 29Ж, 29Ж/4, 29Д/2, 29Д/3, 29И, 29Д, 29Ж/3, 29Ж/5, 29Ж/2
Начальная цена – 2 200 000,00 долларов США
Сумма задатка – 400 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: производственное унитарное предприятие «Промышленная база ФАНИПОЛЬ», 222750, Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 29А.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 0,5 процента от наивысшей цены предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества, подлежащая оплате в белорусских рублях, включает НДС и определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 5 июня 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.05.2018 по 01.06.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(1716) 72-785 (производственное унитарное предприятие "Промышленная база ФАНИПОЛЬ")

Калинка

«МЯДКОЎ ПРАДУКТ» НЕ ПАДВЯДЗЕ

СВЕТЛАГОРСКІ ФІЛІЯЛ УП «КАЛІНКАВІЦКІ МАЛОЧНЫ КАМБІНАТ» — СМАК І ЯКАСЦЬ

ЗА НЕКАЛЬКІ кіламетраў ад Светлагорска размясціўся завод, на якім вырабляюцца прадукты з малака. Заснаваны ён быў ажно ў 1964 годзе. І зусім хутка яго чакае гістарычная падзея — запуск сырнага цэха магутнасцю ў 20 тон за суткі.

Аб гісторыі Светлагорскага філіяла УП «Калінкавіцкі малочны камбінат» расказвае яго **дырэктар Мікалай КАЦЯНКОЎ.**

— Я прадпрыемства ўзначаліў крыху больш за два гады таму. Да гэтага 28 гадоў адпрацаваў у сельскай гаспадарцы, 13 з іх — на пасадзе дырэктара Жлобінскага малочнага завода. У Светлагорск я прыйшоў тады, калі пачалося будаўніцтва цэха, які будзе займацца выпускам сыроў. Калісьці яны ўжо рабіліся на нашым прадпрыемстве. Аднак сырны цэх выпускаў невялікія аб'ёмы прадукцыі — 2—3 тоны ў дзень. У 1991 годзе ён быў закрыты. Пасля гэтага наша прадпрыемства засяродзілася на выпуску сухога малака, масла і натуральнамалочнай прадукцыі. Выпуск сухога малака на прадпрыемстве быў згорнуты пасля аб'яднання з Калінкавіцкім малочным камбінатам, якое адбылося ў 2012 годзе. На жаль, маральна і фізічна састарэла абсталяванне. Рэнтабельнасць нас не задавальняла, і таму вытворчасць сухога малака перамясцілася ў Калінкавічы. А ў Светлагорску пачаў будавацца сырны цэх па інавацыйным праекце.

Новая вытворчасць — гэта гонар прадпрыемства. Было нават і дзіўна, што ў прадуктовых крамах 65-тысячнага Светлагорска сыры прывазныя...

— На цяперашні момант новы сырны цэх гатовы больш чым на 90 %. Будаўнічыя работы выконвае ААТ «Будаўнічы трэст № 20». У асноўным засталося зрабіць аддзелачныя работы. Халадзільнае абсталяванне мы ўжо закупілі. Тэхналагічныя лініі змантіраваны ўжо амаль цалкам. Мяркуем, што ў чэрвені пачнуцца першыя пусканаладачныя работы, а са жніўня сырны цэх запрацуе на поўную магутнасць. Мы бачым, што патрэба рынку ў сырах ёсць. Маркетолагі высветлілі, што 70—75 % малочнай прадукцыі, якая прадаецца ў Светлагорску, — нашай вытворчасці. Значыць, мясцовы пакупнік галасуе рублём за наш тавар «Мядкоў прадукт»!

Якім жа будзе асартымент сыроў? Аб гэтым расказвае галоўны **тэхнолаг Светлагорскага філіяла УП «Калінкавіцкі малочны камбінат» Аксана ГРАБЯНЧУК.**

— Ужо распрацаваны тэхналагічныя інструкцыі шасці відаў сыроў. Гэта цвёрдыя і паўцвёрдыя сыры так званай галандскай, расійскай груп і з павышаным тэрмінам саспявання — так званыя «цвёрдыя» сыры накшталт «Пармезана». Канчатковы ж асартымент будзе ўзгоднены з усімі неабходнымі структурамі. І, канешне ж, ён будзе залежаць

Асноўным інструментам работы прадпрыемства ў галіне якасці з'яўляецца сістэма кіравання якасцю і бяспекай харчовых прадуктаў на аснове прынцыпаў HACCP. Перавага гэтай сістэмы — папярэджанне негатыўных сітуацый у галіне бяспекі прадукцыі, якія могуць негатыўна адбіцца на рэпутацыі і дзейнасці прадпрыемства.

Светлагорскі філіял УП «Калінкавіцкі малочны камбінат» летась спрацаваў з рэнтабельнасцю ў восем працэнтаў. Усяго цяпер на прадпрыемстве працуе 135 чалавек. Сярэдні ўзрост работнікаў — 35—45 гадоў. Сярэдні заробак тут складае 845 рублёў.

Прадпрыемства забяспечвае работу кацельні, якая абслугоўвае пасёлкі Мядкоў і Чыркавічы. Цяпло і гарачая вада з'яўляюцца ў дамах шасці тысяч жыхароў.

ад чаканняў і заявак прадстаўнікоў гандлёвых сетак. Трэба не забывацца і на фінансавую частку — сыры з павышаным тэрмінам саспявання, як правіла, даражэйшыя.

У нас у распрацоўцы ёсць фірменны сыр «Мядкоўскі». Ён будзе выпускацца са смакам адтопленага малака, пажытніка, грэцкага арэха.

— Светлагорскі філіял УП «Калінкавіцкі малочны камбінат» у савецкі час, калі ў нас выпускаліся масла, сыр, сухое малако, экспартаваў сыры не толькі ў Еўропу, але нават і на Кубу і ў В'етнам, — кажа Мікалай Кацянкоў. — Цяпер жа мы запусцім новы цэх,

які будзе працаваць на суперсучасным абсталяванні аўстрыйскай фірмы BERTSCH-LASKA. Дзякуючы гэтаму будзе створана 60 новых працоўных месцаў. Частку супрацоўнікаў, якія будуць заняты на вытворчасці сыру, мы ўжо навучаем на аналагічным прадпрыемстве ў Рагачове. Разлічваем, што гэта дасць нам магчымасць не толькі забяспечваць высакаякаснай прадукцыяй пад брэндам «Мядкоў прадукт» жыхароў Гомельскай вобласці, але і экспартаваць яе за межы краіны.

На экспарт жа цяпер мы практычна не працуем. Галаўное прадпрыемства — Калінкавіцкі малочны камбінат — адпраўляе 80 % прадукцыі за мяжу. Наша ж натуральнамалочная прадукцыя пастаўляецца на ўнутраны рынак. Хоць мяркуем, што пасля запуску сырнай вытворчасці значная частка новай прадукцыі будзе пастаўляцца за мяжу і прыносіць у краіну валюту. Экспарт мяркуецца ў многія краіны — дыверсіфікацыя паставак зараз вельмі важная, каб не залежаць выключна ад адной крыніцы збыту. Партыі прадукцыі з галаўнога прадпрыемства адпраўляліся не толькі ў суседнія Расію і Украіну, але і ў Турцыю, і ў Кітай. Але проста так нас ніхто нідзе не чакае.

15—18 сакавіка 2011 года прадукцыя прадпрыемства прымала ўдзел у IX Міжнародным форуме «Малочная індустрыя» ў Маскве. Свае экспазіцыі прапаноўвалі найбуйнейшыя расійскія і еўрапейскія вытворцы малочнай прадукцыі, абсталявання, упаковачных матэрыялаў. У рамках форуму праводзіўся Усерасійскі дэгустацыйны конкурс «Малочны поспех — 2011», у якім Светлагорскі філіял УП «Калінкавіцкі малочны камбінат» прыняў актыўны ўдзел і заваяваў залаты медаль за сухое абястлушчанае малако. Перамога ў такім прэстыжным конкурсе — пацвярджэнне высокай якасці тавараў маркі «Мядкоў прадукт».

— Прадпрыемства цяпер робіць 30 тон натуральнамалочнай прадукцыі ў дзень. Куды яна пастаўляецца?

Нашу «малочку» пад брэндам «Мядкоў прадукт» закупляюць Гомель, Бабруйск, Мінск, Жлобін, Рагачоў, Рэчыца, Жыткавічы. Што да пастаўшчыкоў сыравіны, то львіная доля — гэта сельгаспрадпрыемствы. Напрыклад, у 1970—1980-я гады працэнт малака ад насельніцтва складаў 35—40 %. Зараз ён не перавышае 3—4 %. Мала хто цяпер трымае кароў. Я сам жыву ў вёсцы і бачу гэтую тэндэнцыю. Калі яшчэ ў пачатку 2000-х у маёй вёсцы насельніцтва трымала 350 кароў, то цяпер толькі 16...

— Малако пітное пастэрызаванае мы робім на свой горад, раён, возім у Гомель, Бабруйск, — кажа Аксана Грабянчук. Таксама выпускаем кефір, смятану і масла — апошняга мы робім прыкладна тону 1—2 разы на тыдзень. Светлагорскае пітное малако мае тлустасць 3,2 і 1,7 %. Тое ж датычыцца і кефіру — 1,8 % і 3 %, і смятаны — 12 і 18 %. Гандлёвыя сеткі таксама ўважліва сочаць за асартыментным пералікам, ім патрэбна прадукцыя як малой тлустасці, так і высокай. Некаторыя рэцэптуры з часам змяняюцца. Не стаіць на месцы заканадаўства, не спыняемся ў развіцці вытворчасці і мы. Расслабляцца няма калі. І нават у такім, здавалася б, не вельмі вялікім асартыменце прадукцыі мы стараемся пастаянна шукаць нешта новае, захоўваючы разам з тым традыцыі.

Наша прадукцыя пакуецца пераважна ў плёнку. Але некаторыя партыі «малочкі» разліваюцца ў каробачкі з Pure-pack, смятаны — ва ўпакоўкі з полістыролу, якія запайваюцца фольгай. Масла ж мы робім як расфасаванае ў брыкеты з фольгі, так і вагавое.

На кожны від прадукцыі ў нас ёсць дэкларацыя, атрыманая ў акрэдытаваным органе. Таму мы маем права продажу прадукцыі ва ўсе краіны Еўразійскага эканамічнага саюза. У планах пакуль што мяркуем наладзіць пастаўкі ў Казахстан.

Радыелагічны кантроль кожнай партыі сыравіны праходзіць на 100 % у нашай уласнай лабараторыі. Кантроль працягваецца ў абавязковым парадку і на выхадзе гатовай прадукцыі. Правяраем таксама матэрыялы, тару, рэжымы і якасці мыцця, дэзынфекцыі абсталявання.

УНП 490424842.

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

■ К@нтыненты

ВЯРТАННЕ ПАЎВОСТРАВА

Калі аб'яднаюцца Паўночная і Паўднёвая Карэі?

Сёння КНДР перайшла на адзіны з Паўднёвай Карэяй час. Стрэлкі гадзіннікаў тут перавялі на 30 хвілін наперад. Такое рашэнне днямі прыняў прэзідыум Вярхоўнага народнага сходу краіны. Як вядома, розніца ў часе паміж краінамі ўзнікла 15 жніўня 2015 года, калі КНДР перавяла стрэлкі на паўгадзіны назад з нагоды гадавіны вызвалення Карэі. Таксама стала вядома, што дзяржавы паўвострава дэмантуюць установленыя на мяжы гучнагаварыцелі для вядзення «псіхалагічнай вайны». Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Мінабароны Паўднёвай Карэі. З іх дапамогай гэтая краіна транслявала навіны, песні папулярных карэйскіх выканаўцаў і крытыкавала рэжым КНДР. Паўночная Карэя, у сваю чаргу, крытыкавала ўрад у Сеуле і прапагандавала сацыялістычную сістэму. Гэта першыя крокі па рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на саміце, за ходам якога без перабольшання сачыў увесь свет, яго ўжо ахрысцілі гістарычным. Што прынясе Карэйскаму паўвостраву «новая эпоха міру»?

Сасна міру

Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — паўднёвакарэйскага прэзідэнта Мун Чжэ Іна і яго паўночнакарэйскага калегі Кім Чэн Ына — прайшла ў памежным населеным пункце Пханмунджом, размешчаным на паўднёвакарэйскай тэрыторыі. Аглядальнікі адзначылі, што абодва лідары трымаліся падкрэслена добразычліва. Яны паціснулі адзін аднаму рукі над раздзяляльнай паласой, якая ў гэтым месцы афармлена ў выглядзе паўметровага бетоннага парапета, і Кім Чэн Ын першым паўночнакарэйскім лідарам, які ступіў на зямлю Рэспублікі Карэя. Поціск рукі палітыкаў пры гэтым, як падлічылі журналісты, доўжыўся 30 секунд. Кім Чэн Ын прапанаваў калегу перайсці на паўночнакарэйскі бок мяжы і таксама зрабіць некалькі здымкаў. Дагэтуль падобныя сустрэчы на вышэйшым узроўні праводзіліся толькі двойчы, у 2000-м і 2007 гадах. Тады з паўднёвакарэйскімі лідарамі сустракаўся Кім Чэн Ір — бацька Кім Чэн Ына. Папярэднія саміты праходзілі ў Пхеньяне.

Перамовы ў Пханмунджоме былі напоўнены сімвалічнымі жэстамі. Так, лідары дзвюх Карэй пасадзілі на дэмаркацыйнай лініі сасну, якая ўвасабляе імкненне дзвюх дзяржаў «да міру і росквіту». Пры пасадцы «дрэва міру» Кім і Мун выкарыстоўвалі глебу з гары Халасан у Паўднёвай Карэі і вулкана Пэктусан у Паўночнай Карэі. Раздзяляльную паласу кіраўнікі дзвюх краін перасягнулі, трымаючыся за рукі. Прайшоўшы ў будынак, які носіць сімвалічную назву — Дом міру, Мун Чжэ Ін заклікаў паўночнакарэйскага прэзідэнта разам несці «мір і росквіт» народам дзвюх краін. Таксама ён адзначыў, што дэмаркацыйная лінія з гэтага моманту стала не сімвалам разладу, а сімвалам міру. Кім Чэн Ын у сваю чаргу заявіў, што прыехаў на саміт з «адчуваннем пачатку новага гістарычнага этапу ў адносінах дзвюх краін». Праз некалькі гадзін стала вядома, што лідары дзяржаў не падманулі чаканняў журналістаў і грамадскасці. Па выніках перамоў было дасягнута пагадненне, якое абяцае стаць паваротным пунктам у гісторыі падзеленага паўвострава.

Ракетны жарт

Карэйскія лідары пацвердзілі, што агульнай мэтай дзвюх краін з'яўляецца правядзенне працэсу дэнуклеарызацыі на Карэйскім паўвостраве, як адзначаецца ў «Пханмунджомскай дэкларацыі аб міры, росквіце і аб'яднанні Карэйскага паўвострава». Гэта азначае, што ўлады КНДР далі прынцыповую згоду на ліквідацыю ядзернай зброі. Аглядальнікі адзначылі, што ў пачатку перамоў Кім Чэн Ын быў прыкметна напружаны і нават дазволіў сабе «ракетны жарт»: пабяцаў Мун Чжэ Іну, што прасочыць за тым, каб ракетныя выпрабаванні не праводзіліся раніцамі і не перашкаджалі спаць суседзям на поўдні.

«На Карэйскім паўвостраве больш ніколі не будзе вайны, пачалася новая эпоха міру», — адзначаецца ў тэксце дэкларацыі. У дакуменце таксама падкрэсліваецца, што дзве дзяржавы «працягнуць актыўны дыялог на ўсіх узроўнях, уключаючы вышэйшы». Акрамя таго, бакі дамовіліся стварыць зону бяспекі ў Жоўтым моры.

Лідар КНДР Кім Чэн Ын падчас сустрэчы з прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Інам заявіў, што ў выпадку падпісання пагаднення з ЗША аб заканчэнні вайны ў ядзерным узбраенні не будзе неабходнасці. Яго словы прывёў прэс-сакратар Муна Юн Ён Чхан падчас прэс-канферэнцыі па выніках перамоў, перадае РІА Навіны. «Калі нашы сустрэчы з ЗША будуць частымі, і ў будучыні будзе пабудаваны давер і дасягнута пагадненне аб недатыкальнасці і аб заканчэнні вайны, навошта ж мець ядзернае ўзбраенне і жыць у цяжкіх умовах?», — працытаваў Юн Ён Чхан заяву Кім Чэн Ына. Кіраўнік Паўночнай Карэі таксама адзначыў, што, «нягледзячы на тое што ён заўсёды выступаў супраць ЗША, людзі зразумеюць, што ён не з'яўляецца тым, хто скінуў бы ядзерную зброю на ЗША, Паўднёвую Карэю ці краіны Ціхаакіянскага рэгіёна».

Паўночная Карэя паабяцала дэмантаваць ядзерны палігон. Працэс дэмантажу пачнецца ў маі і будзе публічным — на палігон запросяць экспертаў па бяспецы і журналістаў. «Некаторыя кажуць, што абсталяванне на палігоне не працуе, але вы ўбачыце, што яно ў добрым стане», — заявіў Кім.

Мадэль Кіма

Сярод матываў дзеянняў паўночнакарэйскага лідара эксперты называюць неабходнасць дамагчыся змякчэння санкцый дзеля актывізацыі эканамічнага развіцця краіны. Заявы Пхеньяна аб ядзерным раззбраенні — гэта такі меседж для ЗША, заўважыў gazeta.ru колішні пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Карэя Глеб Івашанцаў. «Кім Чэн Ын зразумеў, што стварыў той патэнцыял, які можа стрымаць ЗША. І таму ён вырашыў, што цяпер ядзерныя выпрабаванні можна прыпыніць і пераключыць сродкі на развіццё эканомікі», — адзначыў дыпламат.

Як вядома, пасля прыходу да ўлады пяць гадоў таму лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын адкрыта паставіў эканамічны рост у шэраг прыярытэтаў — нароўні з распрацоўкай ядзернай зброі. Вынікам сталі паступовыя рынкавыя рэформы, якія прывялі да хуткага росту прыватных прадпрыемстваў і ўзроўню жыцця, адзначаюць эксперты. Фактычна лідар Паўночнай Карэі выбраў мадэль, якой у апошнія дзесяцігоддзі прытрымліваліся Кітай і В'етнам. Яны імкнуліся да эканамічнага росту з дапамогай рынкавых рэформаў, але захоўвалі жорсткі палітычны кантроль. Кім Чэн Ын таксама правёў шырокія рэформы ў сельскагаспадарчай і прамысловай галінах, надаўшы аб'ектам гаспадарання больш самастойнасці. «Самы галоўны міф аб Паўночнай Карэі — гэта тое, што там усім кіруе дзяржава, — кажа Андрэй Абрахамян з кампаніі Choson Exchange, якая падтрымлівае паўночнакарэйскіх прадпрымальнікаў, — Вобраз Кіма асацыюецца з эканомікай, і гэта ўвязваецца з павышэннем якасці жыцця і спажывецкіх тавараў».

Генеральная рэпетыцыя

Абедзве Карэі захаваюць сваю незалежнасць, але пяройдуць ад палітыкі канфрантацыі да супрацоўніцтва. У перспектыве краіны таксама маюць намер падпісаць мірны дагавор. Як вядома, Карэйская вайна 1950—1953 гадоў, у якой з аднаго боку ўдзельнічалі Паўднёвая Карэя і ЗША, а з другога — КНДР і Кітай, завяршылася падпісаннем перамір'я. Тэхнічна Поўнач і Поўдзень дагэтуль знаходзяцца адно з адным у стане вайны.

Кім Чэн Ын, выступаючы ў Пханмунджоме, адзначыў, што ў будучыні Паўночная і Паўднёвая Карэя павінны зноў стаць адзінай дзяржавай. Зараз, лічаць аналітыкі, ёсць усе перадумовы таго, што гэта эпахальная для Карэйскага паўвострава падзея ўсё ж адбудзецца. Як расказала ў інтэрв'ю RT дацэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына Ланцова, і на Поўдні, і на Поўначы даўно распрацоўваюцца формулы аб'яднання паўвострава. «Ёсць дзве асноўныя канцэпцыі. Першая мае на ўвазе паглынанне адной краіны іншай у выніку пэўных узрушэнняў. Другая мадэль, якая існуе і на Поўначы, і на Поўдні, мае на ўвазе паэтапную канфедэрацыю. Відавочна, што гэта вельмі доўгі працэс, магчымы толькі пры рэалізацыі сумесных эканамічных праектаў. Аднак ва ўмовах санкцый рэалізаваць гэтыя праекты немагчыма, таму першачарговая задача звязана з паступовым зняццем санкцый з КНДР. Але тут усё залежыць ад ЗША, — падкрэсліла Ірына Ланцова. — На ўзроўні афіцыйнага дакумента гэтае палажэнне зафіксавана. У той частцы дэкларацыі, дзе гаворка ідзе пра перамовы па ўсталяванні міру на Карэйскім паўвостраве, гаворыцца пра неабходнасць правядзення трохбаковых і чатырохбаковых сустрэч. У першым выпадку маецца на ўвазе фармат «дзве Карэі плюс ЗША», у другім — той жа склад плюс Кітай. Гэта ўжо крок наперад».

Ці будуць увасоблены на практыцы заяўленыя карэйскімі лідарамі планы, стане ясна на працягу найбліжэйшых месяцаў, лічаць эксперты. Вельмі вялікую ролю адыгрывае асобасны фактар: КНДР прадстаўляе малады і амбіцыйны лідар, які разумее, што краіне патрэбны перамены, а ў Паўднёвай Карэі да ўлады летась прыйшоў палітык левалiберальнага кшталту, таксама нацэлены на дыялог. Дарэчы, для паўночнакарэйскага лідара саміт у Пханмунджоме стаў «генеральнай рэпетыцыяй» перад сустрэчай з Дональдам Трампам. Калі яна адбудзецца (сустрэчу мяркуецца правесці ў маі ў тым жа Пханмунджоме), Кім Чэн Ын стане першым лідарам КНДР, які сустрэнецца з дзеючым прэзідэнтам ЗША. Да гэтага магчымасць правядзення падобнага саміту абмяркоўвалася яшчэ ў гады прэзідэнцтва Біла Клінтана ў канцы 1990-х, аднак тады сустрэча так і не адбылася. Пры Джорджу Бушу адносіны з КНДР былі жорстка замарожаныя. Дарэчы, у 2009 годзе Клінтан — на той момант ужо былы прэзідэнт — усё ж такі даехаў да Пхеньяна, каб дамагчыся вызвалення двух амерыканскіх журналістаў.

Захар БУРАК

■ «Еўрабачанне-2018»

ГЭЙ, ТАМ, НА БОРЦЕ!

Адметная дзясятка ўдзельнікаў сёлетняга песеннага шоу

Ужо заўтра міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне» афіцыйна адкрыецца ў Лісабоне. Усе 43 яго ўдзельнікі ўжо прыбылі, агледзелі горад, апрабавалі сцэну падчас рэпетыцый і далі першыя прэс-канферэнцыі. А ў аўторак, 8 мая, вызначыцца першая дзясятка шчасліўцаў, якія трапяць у фінальны канцэрт. Супервайзеры абяцаюць як заўжды відовішчнае і высокатэхналагічнае шоу, поўнае сюрпрызаў для публікі. Напярэдадні «Звязда» склала спіс з 10 яркіх, правакацыйных і цікавых канкурсантаў, якіх мы ўбачым і пачуем на 63-м конкурсе.

У нумары ALEKSEEV'а хлопец спявае, дзяўчына танцуе, а ружа страляе.

Рамэа і ружа

Свая кашуля да цела бліжэй, таму пачнём з выканаўцы, які сёлета прадстаўляе Беларусь — 24-гадовы ўкраінскі спявак ALEKSEEV. Прадзюсар артыста Алег Баднарчук, вядомы сваімі маштабнымі пастаноўкамі ўкраінскіх і расійскіх поп-артыстаў, прыдумаў зусім іншую канцэпцыю прадстаўлення песні «Forever», чым мы бачылі ў нацыянальным адборы.

Цяпер няма ніякіх святлодыёдаў, затое ёсць люстэркі і рухомая платформа. Пастаноўка зроблена ў беларускіх колерах, а адным з галоўных элементаў яе стала ружа — напачатку кветка нібыта лунае ў паветры, а напрыканцы «страляе» і раніць шыпамі спіну выканаўцы. Мікіту Аляксееву ў нумары асісціруе дзяўчына з дзіўным танцам у стылі кантэмп. «Забаўна і нечакана», — так найчасцей ацэньваюць гэта выступленне фанаты конкурсу, блогеры і замежныя журналісты. Зрэшты, на прагнозы букмекераў эфектнасць нумара паўплывала мала: пасля першых рэпетыцый яны прадракаюць ALEKSEEV'у толькі 20-е месца сярод 43 удзельнікаў.

Тут вам не цацкі

Нумарам адзін у спісе фаварытаў па-ранейшаму ідзе ізраільская спявачка Netta з песняй «Тоу» («Цацка»). 25-гадовая Нета Барзілай — яскравы прыклад таго, як працуе формула «талент плюс упартасць». Атрымаўшы ў дзяцінстве грунтоўную музычную адукацыю, пасля службы ў арміі (між іншым, у войсках ВМФ) Нета зноў вярнулася да свайго захаплення музыкай, заснавала гурт імправізацыйных спеваў, актыўна гастралявала па краіне і за яе межамі і праводзіла семінары для маладых музыкаў. Адметнай фішкай Неты стала выкарыстанне вакальнага лупера — спецыяльнай прылады, якая дазваляе выкарыстоўваць шматлікія галасавыя эфекты (дубліраванне, накладанне, закальцоўванне і г. д.)

Сёлета неардынарная спявачка выйграла рэаліці-шоу «Наступная зорка» і атрымала права прадстаўляць краіну на «Еўрабачанні». А песня яе, якая набрала на YouTube ўжо амаль 18 мільёнаў праглядаў і стала вірусным хітом, нясе насамрэч сур'ёзны пасыл — яна звязаная з рухам супраць сексуальных дамаганняў. Нават «квахтанне» на пачатку песні, гаворыць Нета, мае свой сэнс — яно «парадзіруе голас баязліўца і крывадушніка, які абыходзіцца з вамі як з цацкай».

Двойчы ў адну раку

Нарвежац з беларускімі каранямі Аляксандр Рыбак, які ў 2009-м феерычна выйграў конкурс з максімальнымі на той момант баламі за ўсю гісторыю, вернецца сёлета. І зноў пад нарвежскім сцягам. У звыклым вобразе — на першы погляд крыху нязграбны, але надзвычай абаяльны і дружалюбны скрыпач, спявак, а на гэты раз яшчэ і танцор. Дарэчы, у конкурсным нумары скрыпка, як і іншыя інструменты, будзе ўяўнай, намаляванай з дапамогай спецэфектаў. Букмекеры лічаць, што ў цэлым гэта заяўка як мінімум на другое месца, а то і перамогу ў конкурсе.

Кампазіцыя «That's How You Write A Song» («Вось як трэба пісаць песню») — своеасаблівая падказка таленавітым людзям, як важна верыць у сябе, не баяцца занатоўваць свае ідэі і крок за крокам рэалізоўваць іх. Калі ласка, перадайце хто-небудзь гэты рэцэпт нашым беларускім артыстам, якім год ад году нешта перашкаджае «парваць» залу.

Вярблюда выклікалі?

Адным з самых эпатажных удзельнікаў называюць прадстаўніка Чэхіі, мультыінструменталіста Ёзэфа Мікаласа, які плануе выступіць на конкурснай сцэне... з вярблюдам. Праўда, не жывым (гэта забаронена правіламі шоу), а 3D-карцінкай.

Уласна, вярблюд у нумары — гэта толькі сімвал, але сімвалізуе ён чамусьці не выносівасць або, скажам, наплявальніцкае стаўленне да ўдараў лёсу, а толькі немудрагелістасць песні. Аднак, паводле прагнозаў букмекераў, Чэхія з песняй «Lie to Me» («Схлусі мне») мае ўсе шанцы ўвайсці ў топ-10 лідараў конкурсу.

Усюдыісны Кіркораў

Кароль расійскай поп-сцэны не раз заяўляў, што хворы на «Еўрабачанне» даўно і надоўга, і шмат гадоў удзельнічаў у конкурсе то як кампазітар, то як прадзюсар артыстаў з розных постсавецкіх краін. Не стане выключэннем і бягучы год — сёлета Філіп Бядросавіч напісаў песню для малдаўскага трыа DoReDos і падтрымлівае сваіх падапечных на ўсіх этапах, уключаючы рэпетыцыі ў Лісабоне.



У кліпе Чэхіі здымаўся жывы вярблюд, а на сцэну плануецца вывесці 3D-праекцыю.

Артысты выступяць ва ўборах колераў нацыянальнага сцяга. Усе яны «жывуць» на сцэне ў адмысловым белым доме, паказваючы ў яго вокнах і дзвярах розныя забаўныя позы. Нумар, заўважым, ставіў Фокас Евангелінас — чалавек, які з'еў не аднаго сабаку на еўравізійных пастаноўках для Сяргея Лазарава, Ані Лорак, Дзмітрыя Калдуна, Хелены Папарызу, Дзімы Білана і іншых.

Робаты атакуюць!

Прадстаўніцы Сан-Марына, падобна, «троляць» сваю ізраільскую канкурэнтку: каманда прывезла на «Еўрабачанне» робатаў з патэтычнымі плакатамі «Я не твой робат!» і «Ты выйдзеш за мяне замуж?» Цалкам магчыма, што ў канчатковай версіі сцэнічнага нумара робат нават прапануе заручальны пярсцёнак камусьці з выканаўцаў.

Пасыл песні ў іх таксама падобны — пра тое, што тэрба цаніць і шанаваць унікальнасць кожнага чалавека і нельга здзекавацца з таго, хто чымсьці адрозніваецца ад іншых. «Мы такія, якімі хочам быць, і будзем падымацца кожны раз, калі ўпадзём», — спяваюць Джэсіка і Джэніфер, поўныя рашучасці падтрымаць падлеткаў і дарослых, хто так ці інакш зведаў цкаванне навакольных.

Цікава, хто ў камандзе Сан-Марына дыктуе правілы: дзяўчаты ці робаты?

Мінус тры

Грузінскаму этна-джазаваму калектыву IRIAO дзеля «Еўрабачання» давялося ахвяраваць некалькімі музыкантамі: паводле правілаў конкурсу, на сцэне могуць знаходзіцца толькі шэсць чалавек, а ў гурце іх васьмёра. Аднак канфлікту не здарылася: артысты самі вызначылі, што выступяць у складзе трох вакалістаў, басіста і барабаншчыка.

Песня гурта — «пра той момант, калі вы забываецеся на ўласныя клопаты і працягваеце руку дапамогі іншым, атрымліваючы ў адказ цёплыя эмоцыі». Нумара ў Грузіі як такога няма, але вакальна выступленне бездакорнае, адметнае «фірменным» мужчынскім шматгалоссем.

Вікінг з вялікім сэрцам

Прадстаўнік Даніі Ёнас Расмусен знешне — сапраўдны суровы вікінг, руды і зарослы барадой па вушы. Дэкарацыі для конкурснага нумара ў яго адпаведныя: цемра, парэшткі, завіруха... А вось песня, напісаная шведскімі аўтарамі, — наадварот, пра пошук мірных рашэнняў ва ўсіх канфліктах.

Заснаваная яна, дарэчы, на гістарычным факце: у 1098 годзе вікінг Магнус Эрлендсан адмовіўся біцца з непрыяцелем і сам не абараняўся, але прытым застаўся на сваім караблі, праяўляючы храбрасць, і спяваў царкоўныя псалмы. Не дзіва, што пазней ён быў кананізаваны і ў Скандынавіі ўзнік культ святога Магнуса.

Раяль з начынкай

На 63-м песенным конкурсе будзе некалькі раяляў. Адзін з іх — у нумары Украіны — выкарыстоўвецца як... упакоўка з паўпразрыстай накрыўкай для спевака Melovin. Больш песімістычныя крытыкі папросту зазначаюць, што артыст ляжыць у раялі, нібы ў труне.

Зрэшты, змрочная яго песня якраз пра страхі і забабоны. Страшнаватай містыкі дадаюць і вобраз артыста з рознакаляровымі лінзамі ў вачах, і палаючыя прыступкі на сцэне, так што ў гэтым сэнсе ўсё арганічна. А вось наколькі вынікова і эфектна атрымаецца — пакажа паўфінальнае выступленне.

Жанчына, якая спявае

Вельмі чакаюць фаны «Еўрабачання» і выступлення расіянкі Юліі Самойлавай — летась краіна прапусціла конкурс, бо спявачцы забаранілі ўезд на тэрыторыю Украіны, таму вяртанне мусіць быць як мінімум гучным. І ў любым выпадку заўважным: Юлія — адзіная з удзельнікаў гэтага года, хто мае абмежаваныя магчымасці і перасоўваецца на інваліднай калясцы. Аднак яна ўсяляк падкрэслівае, што не прымае шкадавання, бо з'яўляецца моцным чалавекам і не збіраецца ціснуць на кнопкі жалю і спагады гледачоў. Уласна, аб гэтым гаворыць і песня 28-гадовай артысткі — «I Won't Break» («Я не зламаюся»). Праўда, букмекеры на дадзены момант прагназуюць Юліі толькі 20—25 месца.

...Зразумела, яркіх і эфектных нумароў на «Еўрабачанні-2018» будзе нашмат больш — для кагосьці, можа, і ўсе 43. Таму не будзем спрачацца пра густы — уключайце тэлевізары ўвечары 8, 10 і 12 мая, слухайце і падтрымлівайце тое, што вам сапраўды даспадобы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота eurovision.tv

Эпатажная ізраільцянка Нета з цацкамі-коцікамі.

Украінец Melovin устае з раяля, як персанаж кінастрашылак.

ІДЗІ Ў ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ. І ГАЛОЎНАЕ — НЕ БОЙСЯ

ЯК ЧАЛАВЕКУ З ІНВАЛІДНАСЦЮ АРГАНІЗАВАЦЬ СВАЮ СПРАВУ?

Старшыня грамадскага аб'яднання «Свет без межаў», каардынатар праекта «Пашырэнне магчымасцяў маладых людзей з інваліднасцю праз рэалізацыю права на працоўную і прадпрымальніцкую дзейнасць» Таццяна ПАЕЎСКАЯ:

— Наша дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Свет без межаў» працуе ўжо 18 гадоў з дзецьмі і маладымі людзьмі з інваліднасцю. Увесь гэты час наша дзейнасць у асноўным была накіравана на працу з дзецьмі і маладымі людзьмі, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Такіх інтэрнатаў у Беларусі 10. Яны знаходзяцца ў сістэме Міністэрства працы і сацыяльнай абароны краіны. Нашы праекты накіраваны ў асноўным на дэінстытуалізацыю такіх маладых людзей з падобных дамоў-інтэрнатаў, на тое, каб такіх дамоў было менш, каб у выніку іх колькасць імкнулася да нуля.

Адзін з праектаў быў накіраваны на навучанне маладых людзей жыць самастойна. Каб хлопцы і дзяўчаты атрымлівалі навыкі дарослага жыцця, сацыялізаваліся і выходзілі ў звычайнае жыццё як абсалютна гатовыя да гэтага людзі. Першая пілотная група такога праекта стартавала ў Багушэўскім доме-інтэрнаце. У ліпені 2011 года адбылося ўрачыстае адкрыццё двух дамоў самастойнага пражывання ў вёсцы Рабцава Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У гэтыя дамы былі пераведзены 12 хлопчыкаў і дзяўчатак з Багушэўскага дома-інтэрната (шэсць дзяўчат і шэсць юнакоў). Тады ўсе вельмі хваляваліся. І гэта зразумела: маладыя людзі з асаблівасцямі ў развіцці пачыналі зусім новае жыццё, дзе прыйдзецца вучыцца самастойна вырашаць многія пытанні. Але ў той жа час яны былі вельмі задаволеныя, што ў іх з'явіўся шанц жыць самастойна.

Сёння дадзеная форма працы з людзьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця не толькі знайшла працяг у іншых дамах-інтэрнатах краіны, але і ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні». Мы спадзяёмся, што ў нашых падапечных з'явіліся рэальныя шанцы на новую будучыню, у якой яны змогуць жыць як усе.

Калі выхаванцы аддзялення суправаджальнага пражывання пачалі аднаўляцца ў дзеяздольнасці і выходзіць у свет, яны сутыкнуліся з праблемай працаўладкавання. Бо маладыя людзі не маюць адукацыі, прафесійнай вывучкі, а значыць, працаўладкавацца ім вельмі цяжка.

Мы пачалі маніторыць праблему працаўладкавання, шляхі выхаду, пачалі вывучаць заканадаўства ў гэтай сферы менавіта для людзей з інваліднасцю. І мы падумалі пра тое, што самазанятасць або арганізацыя ўласнай справы можа стаць вартым варыянтам працаўладкавання такіх людзей. Справа ў тым, што мы тут абапіраліся і на ўласны вопыт. Бо падлеткам у дамах-інтэрнатах не даюць прафесію, але іх шмат чаму вучаць. У тым ліку і наша арганізацыя працавала на тое, каб навучыць персанал і выхаванцаў новым відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сучасным методыкам арт-тэрапіі. І зараз яны шмат чаго ўмеюць рабіць рукамі. Напрыклад, добра асвоілі квілінг, мылаварэнне, скрапбукінг, валянне з воўны. Вырабы, трэба сказаць, атрымліваюцца якаснымі. І тут мы задумаліся аб рамеснічтве. Гэта самая простая форма арганізацыі самазанятасці. І калі выпускнікі дамоў-інтэрнатаў не будуць здольныя працаваць з дакументамі індывідуальных прадпрымыкаў (запаўняць бухгалтэрыю, здаваць справаздачы), то рамеснічтвам займацца ім нашмат прасцей: заплаціў адзін раз на год рамесніцкі збор — і працуй. Мы, пачынаючы з рамесніцтва, сталі вывучаць віды самазанятасці, прадпрымальніцкай дзейнасці і прыйшлі да высновы, што гэта можа стаць добрым варыянтам працаўладкавання.

Пазней распрацавалі і напісалі праект у фонд дэмакратыі ААН. Мы выйгралі конкурс, праект быў ухвалены. У яго рамках адкрылі цэнтр развіцця прадпрымальніцкай актыўнасці людзей з інваліднасцю «Вузел». І справа пайшла.

ЗАВЯЗВАЕМ ІДЭІ НА МАГЧЫМАСЦІ

— Кожны чалавек мае права на працу і на рэалізацыю гэтага права ў найбольшай ступені, — лічыць **кіраўнік цэнтра развіцця прадпрымальніцкай актыўнасці людзей з інваліднасцю «Вузел» Вераніка ГЕРАСІМАВА.** — Дарэчы, у нас ёсць слоган «Завязваем ідэі на магчымасці». А 14 верасня 2016 года быў адкрыты наш цэнтр, у якім працуе каманда прафесіяналаў.



Асноўныя кірункі дзейнасці цэнтра — інфармаванне і кансультаванне. Людзям з інваліднасцю расказваюць, якім чынам адкрыць сваю справу. А пачынаюць з выбару напрамкаў дзейнасці, аналізу магчымасцяў чалавека, яго адукацыі, жаданняў і прыярытэтаў. Калі ён сам не вызначыўся ў выбары, што ж ён будзе рабіць? Пасля канчатковага выбару за справу бярэцца юрыст. Ён раіць сабраць пэўныя дакументы, рэкамендуе схадзіць у выканкам, падатковую і зрабіць шмат чаго яшчэ. Юрыст цэнтра нават суправаджае чалавека з інваліднасцю ў яго візітах пры адкрыцці сваёй справы.

Калі ў маладога чалавека ёсць патэнцыял, навыкі, але ён не можа вырашыцца, тады з ім працуе псіхолаг. Такі спецыяліст дае будучаму прадпрымальніку матывацыю, станоўчыя ўстаноўкі, вырашае яго псіхалагічныя праблемы. Перш чым пачаць пэўную справу, кожнаму чалавеку неабходны бізнес-план. Таму ў цэнтры ёсць бізнес-трэнер, які дапамагае напісаць падрабязны бізнес-план. Гэта дазваляе спланаваць усе этапы дзейнасці, падлічыць выдаткі, вырашыць, калі ён выйдзе на пункт прыбытку і гэтак далей. Калі неабходны нейкія бухгалтарскія кансультацыі, то з кліентам цэнтра працуе спецыяліст па бухгалтэрыі. Яны дапамагаюць запаўняць адпаведныя дакументы, якія неабходна несці ў падатковую інспекцыю, дэкларацыі ці яшчэ што-небудзь.

У цэнтры працуе спецыяліст па прасоўванні ў сацыяльных сетках, па маркетынгу, які распрацоўвае рэкламныя стратэгіі. Гэта эксперт, які дапамагае ажыццяўляць продаж. Калі казаць пра рамесніцтва, то тут робім асноўную стаўку на прасоўванне ў сацыяльных сетках. Асабліва калі рамеснікі знаходзяцца ў глыбінцы, дзе-небудзь у вёсках, то ім прадаваць свой тавар пажадана на ўсю краіну з дапамогай сацыяльных сетак. Існуе асобны памочнік, які дапамагае весці гэтыя сацыяльныя сеткі, складсі кантэнт-план на месяц, распрацаваць стратэгію вядзення сетак, рабіць пасты. За гэтыя два гады было праведзена мноства асветніцкіх мерапрыемстваў.

ПАЧНІ СВОЙ БІЗНЕС З НУЛЯ

— Што гэта за асветніцкія мерапрыемствы? Сярод іх мы распрацавалі курс «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці: пачні свой бізнес з нуля», — тлумачыць Вераніка Герасімава. — Праводзілі яго нашы спецыялісты сумесна з адукацыйным цэнтрам «Аўрора Стар». Уладальніца гэтага адукацыйнага цэнтра — прадпрымальніца з інваліднасцю Вольга Палашавец.

Разам з гэтым адукацыйным цэнтрам мы правялі 23 семінары па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці па ўсёй краіне. Яны адбыліся ў Віцебску, Бабруйску, Баранавічах, Гродне, Беразіне, Мінску, Кіраўску, Мазыры, Гомелі і ў іншых гарадах краіны. Мы ў асноўным звязваліся з тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання альбо запрашалі нашы дамы-інтэрнаты, з якімі больш цесна працуем. Запрашалі людзей з інваліднасцю, якія ўжо патэнцыйна гатовыя да арганізацыі самазанятасці, гэта значыць тых, хто пра гэта хоча даведацца больш падрабязна, хто думае, што мог бы ў перспектыве гэтым заняцца.

На семінарах мы гаварылі на тэмы самазанятасці і прадпрымальніцкай дзейнасці. Кожнае мерапрыемства доўжылася два—тры дні па канкрэтна распрацаванай праграме. Згадвалі рамесніцтва, асабістую дапаможную гаспадарку, аграэкатурызм, індывідуальнае прадпрымальніцтва, сістэмы падаткаабкладання індывідуальнага прадпрымальніцтва. Таксама ўздымаліся пытанні аб рэкламе, аб заканадаўстве ў гэтай галіне, аб прасоўванні ў сацыяльных сетках, аб маркетынгу. Гэта далёка не ўсе, але асноўныя тэмы семінараў.

Таксама мы працавалі з установамі сацыяльнага абслугоўвання. Казалі пра тое, што, згодна з новым заканадаўствам, ім дазволена (гэта датычыцца тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, дамоў-інтэрнатаў для маладых людзей з інваліднасцю) прадаваць вырабы, зробленыя людзьмі з інваліднасцю ва ўсялякіх майстэрнях і гуртках. Гэта значыць, зараз можна гандляваць тым, што зрабілі хлопцы і дзяўчаты, пазбаўленыя дзеяздольнасці. Атрыманыя за гэта грошы ідуць на пазабюджэтнае фінансаванне. Пасля чаго грошы гэтыя размяркоўваюцца ўстановай самастойна. На жаль, выплачваць гэтыя грошы непасрэдна выхаванцам дамоў-інтэрнатаў нельга, але можна заахвочваць паездкамі, арганізаваць за гэтыя сродкі святочныя абеды ці салодкі стол. За гэтыя грошы дазваляецца набыць новае абсталяванне, новыя матэрыялы, запрасіць сучасных трэнераў, якія навучаць новаму. Гэта таксама вельмі добрая перспектыва. На сваіх семінарах мы казалі аб арганізацыі гандлёвага пункта такімі ўстановамі. Што для гэтага неабходна, пад якое гэта трапляе заканадаўства, расказвалі, як там прадаваць свае тавары, прасоўваць іх і многае іншае. Майстар-клас мы назвалі «ХобіБізнес». Іх у нас прайшло чатыры, два такія майстар-класы былі праведзены толькі для людзей з інваліднасцю з дамоў-інтэрнатаў і яшчэ два былі змешанага тыпу.

Адзін з такіх майстар-класаў прайшоў для аддзялення суправаджальнага пражывання Багушэўскага дома-інтэрната. Пасля ўдзелу ў мерапрыемстве людзі вельмі загарэліся ідэяй мылаварэння. І ўвасобілі яе ў жыццё. Закупілі мноства матэрыялаў (дзякуючы спонсарскай дапамозе) і цяпер вараць мыла практычна на прафесійным узроўні. Выкладала ім наш трэнер па мылаварэнні рамеснік Ганна Дундукова. Гэта самы запатрабаваны спецыяліст у адпаведнай галіне. Яна і зараз дапамагае Багушэўску, кансультуе іх, дае практычныя парады.

ПРЫГАЖОСЦЬ НА КОНЧЫКАХ ПАЛЬЦАЎ

Работнікі цэнтра «Вузел» правялі майстар-класы сумесна з адукацыйным цэнтрам «Аўрора Стар» па паслугах прыгажосці. Стала адкрыццём тое, што сфера прыгажосці для людзей з інваліднасцю ў прафесійным плане вельмі даступная. На самай справе цяпер заканадаўства ў нас змянілася такім чынам, што, напрыклад, той жа манікюр, педыкюр, нарошчванне вееж і догляд броваў, іншыя касметычныя паслугі можна аказваць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, па адзіным падатку. А гэта вельмі спрашчае дзейнасць у гэтай галіне. Плюс паслугі можна аказваць дома. Калі, напрыклад, чалавек з інваліднасцю маламабільны, то для яго гэта вельмі перспектыўны занятак.

Падчас майстар-класаў па паслугах прыгажосці «Прыгожых спраў майстар» гаварылі таксама аб масажы і спа-працэдурах. Гэта вельмі перспектыўны від дзейнасці, напрыклад для невідушчых. Вольга Палашавец — кіраўнік адукацыйнага цэнтра, яна ж начальнік спа-кабінета «Алтэя Спатур». Сама Вольга абсалютна невідушчы чалавек, нягледзячы на гэта, яна маці траіх дзяцей і досыць паспяховы прадпрымальнік. Унікальных здольнасцяў чалавек.

Выстаўка-кірмаш «Я магу» знаёміць грамадства з вынікамі прадпрымальніцкай дзейнасці людзей з інваліднасцю.

як працаваць і каму там працаваць. Тэма складаная, але патрэбная.

— Семінары былі вельмі запатрабаваныя, на кожным з іх было не менш за 30 удзельнікаў, як людзей з інваліднасцю, так і прадстаўнікоў сацыяльнай сферы, грамадскіх аб'яднанняў, журналістаў і прадпрымальнікаў. На кожны такі семінар былі запрошаны прадпрымальнікі з інваліднасцю. Паспяховыя бізнесмены расказвалі, як ім удалося стварыць сваю справу, якія ў іх былі праблемы ці якіх станоўчых момантаў і вынікаў яны дамаглі.

Адным з такіх людзей, якія вельмі часта ездзілі з намі на розныя мерапрыемствы, стаў прадпрымальнік з інваліднасцю, кіраўнік прадпрыемства «Інва-аўтасэрвіс» Аляксандр Махаратаў. Гэта малады чалавек на калясцы, які змог стварыць свой бізнес. Яны зараз правялі рэбрэндынг, называюцца «Інва-Тэх» і вырабляюць інвалідныя каляскі актыўнага тыпу, якія ў нас у краіне больш ніхто не вырабляе. Такія каляскі вырабляюцца індывідуальна, пад патрабаванне кожнага чалавека. Каляскі атрымліваюцца як быццам адмыслова створаныя для сваіх новых уладальнікаў. Аляксандр на нашых семінарах у якасці ментара дзяліўся сваім вялікім вопытам, «лайфхакамі», расказваў, якім чынам якую палёгку атрымаць. А ў выніку з многімі ўдзельнікамі семінараў ён мае зносіны і цяпер. Яны яму тэлефануюць напрамую, просяць парады. Аляксандр адкрыта дзеліцца сваімі ведамі і напрацоўкамі.

МАЙСТАР-КЛАСЫ АД ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Яшчэ адным відам мерапрыемстваў сталі майстар-класы. Усяго было праведзена 12 майстар-класаў па пяці напрамках занятасці. «Мы для сябе таксама вызначылі найбольш перспектыўныя напрамкі, у якіх будзем працаваць з людзьмі з інваліднасцю, — кажа Вераніка Герасімава. — Варта адзначыць, што майстар-класы — гэта мерапрыемствы больш вузкага кірунку, якія прызначаны для таго, каб чалавека паглыбіць у свет пэўнай прафесійнай накіраванасці. У нас былі майстар-класы па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і рамесніцтве, дзе мы вывучалі гэтую тэму тры дні. Акрамя таго, мы сумесна з юрыстам разбіраліся, што такое рамесніцтва і зарэгістраваны ў якасці рамеснікаў або прадпрымальнікаў. Яны накіраваны на пашырэнне сеткі дзелавых кантактаў і кліенцкай базы.

Па сутнасці, гэта былі масавыя рэкламныя акцыі. Правялі сем прома-сустрэч для прадпрымальнікаў з інваліднасцю. Адна з іх была для Юлі Ардынавой і яе майстэрні «Неваляшка Ард». Гэтая дзяўчына з інваліднасцю з Віцебска займаецца валяннем з воўны. Яна зарэгістравала рамяства, а потым у рамках праекта стала прадпрымальніцай. У Юлі пайшло пашырэнне дзелавых кантактаў, і ёй прапанавалі супрацоўніцтва з крамамі пінскага трыкатажу. А для гэтага трэба было афармляць ІП.

Рабілі прома-акцыю для Святланы Пашукевіч, якая зарэгістравала рамяства і стварыла свой асабісты брэнд «Кандытарская мыла ручной работы «Кураган».

Семінар «Прадпрымальніцтва для пачаткоўцаў, або Як ператварыць ідэю ў прыбытковы бізнес за пяць дзён».

Мы назвалі сваю майстэрню «Кандытырскай», бо наша мыла хочацца з'есці, як жартуе сама Святлана. Пасля ўдзелу ў нашых семінарах яна спачатку адкрыла рамяства, а потым зарэгістравалася і як індывідуальны прадпрымальнік. Цяпер яна супрацоўнічае з нашым цэнтрам, праводзіць майстар-класы па мылаварэнні, выступае на семінарах як спікер-матыватар. Збіраецца пашырацца і адкрываць асобную краму для мылавараў. Ні многа ні мала — проста краму. І яшчэ нешта, але пакуль сакрэт. Вераніка Герасімава ўпэўненая, што ў таленавітай дзяўчыны ўсё атрымаецца.

Рэкламная сустрэча была праведзена для мантэсоры-студыі з Гродна, кіраўніком якой таксама з'яўляецца дзяўчына з інваліднасцю. Для івэнт-агенцтва з Гродна і прадпрымальніка з Бярозаўкі былі таксама прома-акцыі. У рамках асобнай рэкламнай акцыі быў створаны ў Баранавічах рамесны каворкінг «Добрыя падарункі». Ён прапануе эксклюзіўныя сувеніры ручной работы, зробленыя людзьмі з інваліднасцю. Рамесны каворкінг працуе на базе тэрытарыяльнага цэнтра і налічвае больш за 16 рамеснікаў з інваліднасцю. Рэкламная акцыя доўжылася два дні. Цяпер з імі працуюць нашы трэнеры па прасоўванні. Былі адкрыты групы «ВКантакце» і ў «Інстаграме» па прасоўванні сваёй прадукцыі ў сацыяльных сетках.

РАСКАЗАЦЬ АБ ПРАБЛЕМАХ, ПАКАЗАЦЬ СЯБЕ

Яшчэ адзін напрамак датычыцца інфармацыйнай і інтэграцыйнай кампаніі. Гэта масавыя мерапрыемствы, накіраваныя на тое, каб людзі звярнулі ўвагу на праблемы працаўладкавання для людзей з інваліднасцю.

Былі праведзены сумесныя з камітэтам па працы і занятасці Мінскага гарвыканкама дзве вялікія выстаўкі-кірмашы, якія называліся «Я магу!». Падчас свята горада каля Мінскай ратушы быў арганізаваны вялікі горад майстроў, дзе прымалі ўдзел прадпрымальнікі, рамеснікі з інваліднасцю і ўстановы сацыяльнага абслугоўвання, якія прадавалі свае вырабы ручной работы. Было паказана, што людзі з інваліднасцю могуць ствараць тавары выдатнай якасці, якія могуць канкурыраваць на адкрытым рынку працы. Запрашалі туды не толькі рамеснікаў, але і досыць паспяховых прадпрымальнікаў.

Некалькі слоў пра вялікі форум па праблемах працаўладкавання людзей з інваліднасцю ў Віцебску. Ён быў праведзены сумесна з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама. Праходзіў у Лядовым палацы. Там было больш за 250 удзельнікаў з пяці краін блізкага замежжа (Расія, Малдова, Літва, Казахстан і Беларусь). Казалі аб праблемах працаўладкавання, аб міжнародным вопыце вырашэння такіх праблем. Форум прайшоў на высокім узроўні.

У цэнтра развіцця прадпрымальніцкай актыўнасці людзей з інваліднасцю ёсць свой сайт uzel.by. На гэтым сайце ёсць база даных бізнес-планаў па арганізацыі ўласнай справы, якая з'явілася ў нас у выніку адкрытага конкурсу бізнес-ідэй. Конкурс праводзіўся яшчэ ў пачатку праекта. У ім меў магчымасць прыняць удзел любы чалавек, галоўным крытэрыем было, каб бізнес-ідэя падыходзіла для рэалізацыі людзьмі з інваліднасцю. Было атрымана больш за 100 заявак з усёй краіны, а ў выніку адзначана 10 пераможцаў і яшчэ 10 чалавек былі адзначаны спецыяльным прызам. Пераможцы атрымалі матэрыялы і (або) абсталяванне на рэалізацыю сваёй ідэі.

У НАС ТРЭБА ПРОСТА ПАВЕРЫЦЬ

З якімі цяжкасцямі сутыкнуліся работнікі цэнтра «Вузел» пры рэалізацыі гэтага праекта? Гэта праблемы не праекта, а хутчэй усяго грамадства. Першая праблема ў стэрэатыпах. абывацелю думаюць, што людзі з інваліднасцю ні на што не здольныя. Што яны не могуць канкурыраваць на адкрытым рынку працы, тым больш не здольныя адкрыць сваю справу. А як жа дзясяткі паспяховых прадпрымальнікаў, рамеснікаў ды і проста таленавітых людзей з інваліднасцю?

Нам трэба толькі паверыць у іх, заўважаць іх, не перашкаджаць, а лепш дапамагаць ім. А таксама расказваць пра паспяховы вопыт такіх людзей на ўсю краіну, каб яны змаглі паверыць у свае магчымасці.

Другая праблема датычыцца боязі цяжкасцяў, з якімі людзі з інваліднасцю яшчэ нават не сутыкнуліся. Быццам бы бізнес — гэта нешта такое складанае, недаступнае большасці людзей. Калі на семінарах па рамесніцтве ўсё было зразумела і проста, гэта выклікала недавер. Наступная праблема датычыцца адукацыі. Не хапае якаснай, прафесійнай адукацыі і адсутнічае даступнае асяроддзе для яе атрымання для людзей з інваліднасцю. Для маламабільных людзей адсутнасць даступнага асяроддзя стане непераадольнай перашкодай пры атрыманні адукацыі.

Але, напэўна, самая вялікая і галоўная праблема — стэрэатып у саміх людзей з інваліднасцю. Чамусьці многія з іх лічаць, што яны не могуць. Не могуць працаваць, не змогуць адкрыць сваю справу, ды наогул не змогуць ні з кім канкурыраваць. Магчыма, гэта звязана з тым, што дзяржава дае ім пенсію і ўсё астатняе павінна прынесці ім на сподачку. Але для таго, каб чалавек адкрыў сваю справу, ён павінен нешта ўмець. А для гэтага трэба навучыцца рабіць нешта добра. Значыць, трэба пайсці на курсы, прыкласці намаганні. Пры неабходнасці трэба самастойна і бізнес-план скласці. Спецыялісты дапамогуць яго распрацаваць, але «галоўнай скрыпкай» застаецца новы прадпрымальнік, рамеснік ці проста паспяховы чалавек.

Заснавальнік майстэрні па мылаварэнні «Кураган» Святлана ПАШУКЕВІЧ:

— Я выкладчык рускай мовы і літаратуры, скончыла БДУ, працавала ў школе па спецыяльнасці. Потым знайшла працу ў адукацыйным цэнтры. Там працую другі год. Мяне ўсё задавальняе, але...

З'явіўся вольны час, і я стала займацца мылам... Мне гэта падабаецца. Аб'ядналася са сваёй сяброўкай-мастачкай. Яна не зусім варыць, больш займаецца пакаваннем. Варылі мыла і збывалі патроху. Але хацелася працаваць правільна, каб у дзяржавы да нас не было пытанняў. І тут мне пашанцавала. Выпадкова ўбачыла аб'яву аб правядзенні семінара цэнтрам «Вузел» ад арганізацыі «Свет без межаў». Я вельмі здзівілася, што яны робяць такія патрэбныя рэчы (адукацыйныя мерапрыемствы) для інвалідаў абсалютна бясплатна.

Адразу пасля семінара я стала рамеснікам на мылаварэнні. Рэалізавалі сваю прадукцыю і задумаліся. Нам прапанавалі афармісца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Калі б не было ў мяне семінара за плячыма, то пабаяліся б рэгістравацца ў якасці ІП. А так мне на семінары ўсё расказалі і я ведала, што гэта не цяжка. Вось ужо год у нас ёсць «Кураган», наша кандытарская мыла. Інвестыцыі свае мы акупілі. Проста варыць цяпер нам мала. Мы хочам вучыць, як трэба правільна варыць якаснае мыла. Спадзяёмся ў будучыні адкрыць магазін для мылавараў.

Дарэчы, мыла вараць шмат людзей. Многія робяць гэта не вельмі якасна, ды і не вельмі прыгожа. Калі мы можам навучыць, то чаму б не паспрабаваць. Самі цяпер купляем розную літаратуру за мяжой. Аказваецца, там шмат сакрэтаў. Перакладаем артыкулы, разбіраемся. Вывучаем новыя тэндэнцыі. І яшчэ. Цяпер я праводжу майстар-класы для дзяцей з інваліднасцю. А цэнтр «Вузел» мне ў гэтым усяляк дапамагае.

Сяргей КУРКАЧ.

УНП 101764490

Форум па працаўладкаванні для людзей з інваліднасцю ў Віцебску.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 15 (411)
ЗВЯЗДА 5 мая 2018 г.

НЕВЫМОЎНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ РАЗВІТАННЯ

Чаму на сцэне опернага тэатра плача Парыж?

...А вы б хацелі пабываць у Парыжы пачатку мінулага стагоддзя? О, гэта быў горад магчымасцяў для розных творцаў, куды іх прыводзілі надзеі паказаць сваё мастацтва, знайсці аднадумцаў, якія таксама жывуць мастацтвам. І тыя, хто гатовы быў пацярпець за мастацтва, атрымалі сваю славу — своечасова, калі пашчасціла, ці ўжо пазней...

У атмасферу таго Парыжа, куды імкнуліся нашы Марк Шагал і Хаім Суцін, паглыбіцца проста — трэба ісці на спекталь у Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр Беларусі, дзе ў афішы ёсць опера «Багема» Джакама Пучыні ў пастаноўцы народнага артыста Расіі, лаўрэата расійскай тэатральнай прэміі «Залатая маска», прафесара Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва Аляксандра Цітэля. Яго пастаноўка здолела не проста ўвесці ў свет оперы Пучыні, яна перадала сапраўдны дух тагачаснай багемы. І нават больш — паказала Парыж, стварыла яго вобраз, які фактычна становіцца яшчэ адным, асобным — і нават бачным — дзейным персанажам спектакля, які жыве на сцэне, радуецца і нават пакутуе разам з героямі.

Яны асаблівыя: бедныя, з тонкай душой, рамантычныя, натхнёныя і багатыя на пачуцці. Паэт Рудольф, мастак Марсель, філосаф Кален і музыкант Шанар. Творчыя і вельмі рамантычныя асобы. А гэта цікава. Магчыма, у тым і прычына запатрабаванасці оперы «Багема» Джакама Пучыні: прадстаўлена трэцяя яе пастаноўка на сцэне нашага опернага тэатра. Дагэтуль «Багему» ставілі ў 1968-м і 2002 гадах. Яна кранае музыкай — вельмі лірычнай, што ўводзіць у свет пачуццяў галоўных герояў Рудольфа і Мімі. Таму, відаць, «Багема» — адна з найпапулярнейшых опер, якую любяць ва ўсім свеце. І сапраўды, дагэтуль здавалася, што як бы яе ні ставілі, усё адно слухаць яе прыемна.

Але вялікім культурным уражаннем стала магчымасць не проста слухаць яе ў новай пастаноўцы. Цяпер гэтую оперу прыемна яшчэ і разглядаць — кожны куточак сцэны, кожны сюжэт, на фоне якога разгортваюцца падзеі, кожную дэталь і кожнае імгненне хочацца ўхапіць ва ўсіх падрабязнасцях, імкнешся паспяваць за зменлівасцю і трансфармацыяй карцін на заднім плане... І разумееш: каб аціць увесь маштаб, прыгажосць, нават фантастычнасць гэтай пастаноўкі, на «Багему» трэба будзе хадзіць яшчэ і яшчэ, і будзе магчымасць кожны раз адкрываць у гэтым спектаклі нешта новае. Гэта ж цудоўна! Каб опера так вабіла і чапляла не толькі музыкай... Гэта той варыянт, калі сышлося ўсё: рэжысёрскае прачытанне, мастацкае адлюстраванне і спевы салістаў — аказваецца, усе нашы, усе працуюць выдатна, калі адчуваюць — дзеля чаго. І аркестр часам (здаецца!) адчувае, як дыхае спектакль, і ідзе ўслед за ім — тут менавіта гэта і трэба. Сышлося ўсё — і нарадзілася мастацтва на сцэне.

Аляксандр ЦІТЭЛЬ.

Для Аляксандра Цітэля праца над «Багемай» не першая. Ён узначальвае оперную трупу Маскоўскага музычнага тэатра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі, на сцэне якога ідзе гэты твор у яго ж пастаноўцы. Чым асаблівая беларуская версія?

Опера была створана Пучыні ў канцы XIX стагоддзя і расказвала пра жыццё маладых творцаў, што імкнуліся ў Парыж у надзеі рэалізавацца. Гэта бліжэй да часу імпрэсіяністаў. А ўжо на пачатку XX стагоддзя Парыж стаў нефармальным цэнтрам мастацтва Еўропы, дзе віравалі розныя мадэрнісцкія ідэі і плыні. Менавіта гэты часавы перыяд больш прывабіў рэжысёра: у спектаклі дзеянне адбываецца прыкладна ў 20-я гады мінулага стагоддзя.

Мадэрнісцкія настроі XX стагоддзя, пошукі мастацкай свабоды і чалавечай шчырасці і праз сто гадоў прыцягальныя. Пастановачная група робіць рэверанс у бок Беларусі: на сцэне творы Шагала, Суціна, Малевіча...

Час тут відаць не толькі як антураж — сам кантэкст існавання мастацтва і творчага асяроддзя для гэтай оперы вельмі важны. Таму праз гэтую гульню з часам праступае яшчэ вобраз самой творчасці: яна ў адмысловых і неверагодных строях артыстаў у масавых сцэнах — вы нібыта назіраеце за вуліцамі Парыжа. Творчасць увасабляе і кожны з сяброў: іх род заняткаў рэжысёр акцэнтуе ці то аркушамі паперы альбо кнігай, пэндзлем ці музычным інструментам. Кожны з чацвёркі імкнецца выжыць у гэтым горадзе, не губляе аптымізму: іх паглынаюць мары пра будучую выстаўку. І, здаецца, мы гэтыя мары «бачым» на свае вочы — карціны на заднім плане трансфармуюцца, перацякаюць адна ў адну, перадаючы настрой герояў. Яны сугучныя і каханню, падкрэсліваючы рознасць яго праяў. Мімі змагаецца з хваробай, баіцца страціць каханага. Мюзэта наадварот — нібыта гуляе пачуццямі свайго сябра.

Аўтар сцэнаграфіі Юрый Усцінаў, мастак па касцюмах Ірына Акімава згодна з рэжысёрскай канцэпцыяй стварылі мінімалістычныя дэкарацыі, якія могуць «ажываць» (дзякуючы прыёму «кінетычнага жывапісу»). Побытавы фактар мінімалізаваны: прадстаўнікі парыжскай багемы жывуць у вялікім памяшканні, знятым для правядзення выстаўкі. І ўсё на гэта працуе. Пераказваць мастацкі складнік новай «Багемы» — няўдзячная справа. Бо гэта трэба бачыць — бы мы ідзём на цікавую выстаўку.

Наогул, у гэтым спектаклі творчасць ва ўсім: у дэталях, якія абазначаюць прастору, — ці гэта прыдуманая «чарачная» на заднім плане (які Парыж без кафэшак?), ці балкон для рамантычных прызнанняў у выглядзе туфліка на высокім абцасе, ці кранальны ложак для апошняга ўздыху галоўнай гераіні. Тут прадуманы кожны момант, кожная мізансцэна: як героі знаёмяцца і як размаўляюць, што ў іх на стале, нават калі на сцэне сметніца, то яе існаванне абгрунтаванае дзеяннямі персанажаў, а калі патрэбна, з'яўляецца прыбіральшчыца, а за ложкам Мімі, нібыта за катафалкам, ідуць верныя сябры...

«Не, немагчыма плакаць, бо чула оперу не адзін раз», — пераконвала я сябе ў зале. Стрымацца было складана. І стала зразумела, што значыць пачуццёвасць оперы: калі за некалькі гадзін спектакля перажыў палітру адчуванняў, кожнае з якіх было рэальным, бо нараджалася ў сэрцы, а ты сам з'яўляўся часткай гэтай чароўнай атмасферы, — і тады навошта стрымлівацца? І як магчыма не крычаць «брава» выдатнай Мімі ў выкананні маладой спявачкі Марты Данусевіч, якая шмат для каго можа стаць асабістым адкрыццём (выхаванка беларускай школы, дарэчы). І Рудольф Аляксандра Міхнюка ды Марсель Уладзіміра Громава былі такімі ж пераканаўчымі (не толькі ў спевах, але і ў акцёрскай ігры). І аркестр (дырыжор-пастаноўшчык — заслужаны артыст Украіны Віктар Пласкіна) здолеў падкрэсліць ціхі момант развітання назаўсёды.

І карціны на сцэне перацяклі ў чорны квадрат, за якім, магчыма, нічога няма, акрамя самой містыкі мастацтва.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Вернісаж

«Любоў да месца, з якім звязаны»

У Мастацкай галерэі Савіцкага дэманструецца выстава мастака Кастуся Качана «Правінцыя». У яго творчасці знайшло адлюстраванне жыццё мястэчак і невялікіх гарадкоў ва ўсёй іх прыгажосці: кожны знойдзе імгненне, злоўленае творцам, якое прыйдзецца даспадобы. Сімвалічнай стала назва экспазіцыі, якая налічвае больш за 80 палотнаў, і прысвячаецца Году малой радзімы. Вернісаж сабраў мноства гасцей, сярод якіх былі сябры, калегі і прыхільнікі таленту жывапісца.

Намеснік старшыні па арганізацыйных і творчых пытаннях Саюза мастакоў Беларусі Леанід Хобатаў адзначыў, што ў аснове стаўлення Качана да жыцця закладзена некалькі пастулатаў: Айчына і пачуццё радзімы, любоў да месца, з якім ён звязаны. Разам з тым прамоўца падкрэсліў адметнасць жанру пейзажа, паколькі гэта асобая форма ўспрыняцця свету.

Акрамя гэтага, са словамі падзякі выступіла намеснік старшыні Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта Святлана Каралько. Яна адзначыла важны момант у развіцці культурнай інфраструктуры на роднай жывапісцу Навагрудчыне: адкрыццё адной з першых прыватных пляцовак у Беларусі, дзе спалучаюцца выставачныя залы і майстэрня карціннай галерэі Кастуся Качана.

Сярод ганаровых гасцей быў мастак Ігар Бархаткоў, які звярнуў увагу слухачоў на своеасаблівасць светабачання майстра, паколькі такога адчування маленькіх гарадкоў, мястэчак не было за ўсю гісторыю беларускага мастацтва. А Наталля Сяліцкая, мастацтвазнаўца, расказала пра актуальнасць пейзажа ў кантэксце беларускай культуры: у адрозненне ад еўрапейскай практыкі, ён будзе яшчэ доўгі час жыць і развівацца як самастойны жанр, праз які творца можа паўнавартасна ажыццяўляць свае ідэі. Была пададзена кароткая творчая характарыстыка мастака, згодна з якой ён з'яўляецца прадаўжальнікам пленэрнай і рускай рэалістычнай традыцый, у яго пейзажах гарманічна суіснуюць прырода і чалавек.

Сам Кастусь Качан, які коратка апісаў экспазіцыю: «Вы ўбачыце творы, якія я пісаў на працягу апошніх дзесяці-дванаццаці гадоў. Гэта і ёсць мой свет. Свет, які я вельмі люблю». Па заўвагах сяброў, жывапісец шмат плённа піша, не спыняючы працу на пленэрах нават у складаных умовах.

Выстава «Правінцыя» — доказ таго, што беларускае мастацтва жыве, працягваючы пэўныя кірункі і традыцыі славутых папярэднікаў. Не згубіцца сярод іншых творчых індывідуальнасцяў дазваляюць яркая манера і адметнае светаадчуванне. А пра талент сведчыць той факт, што творы Качана прызнаныя не толькі ў Беларусі, але і за мяжой, і знаходзяцца не толькі ў фондах беларускіх музеяў і цэнтраў, але і ў прыватных калекцыях Бельгіі, Германіі, Літвы, Польшчы, Расіі, ЗША, Турцыі, Паўднёвай Карэі і іншых. «Правінцыя» дае магчымасць пабачыць свет вачыма творцы, адчуць яго і заўважыць прыгажосць у няхітрым на першы погляд сюжэце, успомніць дарагія сэрцу мясціны і больш уважліва прыгледзецца да таго, што мы бачым часта, але чаму звычайна не надаём асаблівага значэння. Наведаць экспазіцыю можна да 20 мая.

Арына ГАРДЗЕЙ

■ Кінакрокі

«У ЦЯБЕ БЫЛА Б КВАТЭРА І ЎСЁ ІНШАЕ, А ТЫ, ДУРАНЬ, — У КІНО»

Андрэй Кудзіненка не толькі культавая персона ў беларускім кіно, але і эфектны расказчык. У яго аповедах аказваюцца дзясяткі цікавых гісторый, жартаў, фактаў, і ўсё гэта з пэўнай доляй самаіроніі і лёгкім стаўленнем да навакольнай рэчаіснасці. Менавіта таму мы не прапусцілі творчую сустрэчу з рэжысёрам, арганізаваную цэнтрам «АРТ Карпарэйшн» у рамках праекта «ТАК: Тэатр. Адукацыя. Кіно». Новы праект змяшчае ў сабе тое найлепшае, што можа даць публіцы Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў, які займаецца арганізацыяй найбуйнейшых тэатральнага і кінафестывалю краіны. «Стварэнне любові паміж мастацтвам і публікай» — такую задачу ставяць перад сабой арганізатары «ТАК». Мы ж у сваю чаргу дзелімся тым, што Андрэй Кудзіненка ў прыемных прыцемках прасторы «Ок16» расказаў на сваёй творчай сустрэчы.

Пра фільм «Розыгрыш» і Паўла Лунгіна

Было добра, калі Лунгін з'ехаў на дайвінг. А потым ён вярнуўся... Як ён еў мозг! У цябе самы складаны момант, вялікая масоўка, дзеці ідуць у школу, дрэнны стэдзікамшчык, а ён бегае за табой паўсюль і кажа: «Не атрымаецца, Андрэй, не атрымаецца». Я яму затое ўспамінаў Гадара, якога той не любіць. Неяк на Канскім кінафестывалі Гадар сказаў: «Паглядзіце, як Лунгін есць ёгурт — відаць, што прайдзісвет». І калі Лунгін запытаўся, хто мой любімы рэжысёр, я сказаў: «Гадар!» Гэта было па-сяброўску, але потым ён стаў монстрам. Пасля поспеху фільма «Востраў» яго пачало накрываць, а пасля «Цара» ён проста паляцеў. Са студыі, з якой Лунгін працаваў, сышлі ўсе. Помню, на прэм'еры нейкага яго фільма падыходзіць яго жонка і кажа: «Пазвані Паўлу Сямёнавічу, павіншуй». Я бяру тэлефон, званю, віншую Лунгіна з прэм'ерай, а ён адказвае: «Не тое кажаш, Андрэй, не тое», — тады я гавару: «Павел Сямёнавіч, вы геній!» — «Во, ведаеш словы!» На мантажы мы з ім зноў пасварыліся, я ўжо хацеў сыходзіць з карціны, але потым мы прыйшлі да закадравага тэксту, прычым пісаць яго павінен быў Іван Ахлабысцін, які сказаў: «Я напішу вам такі тэкст!» і знік. Я ўжо і матушцы яго тэлефанаваў (тады Ахлабысцін яшчэ быў праваслаўным бацюшкам), а ў выніку сам пісаў.

Як выбраў прафесію

Я вучыўся яшчэ ў савецкі час, калі пасля заняткаў усе беглі ў кінатэатр, аддавалі 10 капеек, прагульвалі дзеля кіно, глядзелі ўсё запар. Кожны раз пасля праграмы «Час» я глядзеў фільм, абавязкова. А потым з'явіліся відыкі. У Брэсце, дзе я нарадзіўся і жыў, софікі (кіроўцы «Саўтрансаўта». — **Аўт.**) прыганялі гэтыя відыкі з заходніх краін і ўвесь час ставілі ўсялякі шлак кшталту «Рэмба 2». Хоць я з задавальненнем глядзеў фільмы з Ван Дамам, Брусам Лі, Чакам Норысам, Джэкі Чанам. Мы паглыналі ўсё запар, а няшчасныя ўладальнікі відэамагнітафонаў глядзелі фільмы па мільёне разоў і часта казалі «тут я раскажу» — ставілі на перамотку і пераказвалі сюжэт. У нас быў аднакласнік, сын дырэктара лікёра-гарэлачнага завода, — у яго першага відык з'явіўся.

А ўжо ў інстытуце ў нас быў нейкі падпольны «Сёмы канал», дзе сядзеў змрочны хлопец у стылі Depeche mode і паказваў фільмы, проста адзін за адным. Потым, калі я вывучаў гісторыю кіно ў Акадэміі мастацтваў, аказалася, што вялікую частку таго, што было патрэбна, я ўжо бачыў — і «На апошнім дыханні», і Бертрана Бліе, і Марка Ферэры. А чаму я пасля школы паступіў у палітэх? Таму што гэта практычна. А куды яшчэ? Я добра ведаў матэматыку і фізіку. Бацькі казалі: «Будзеш інжынерам — заўсёды знойдзецца праца», а якраз на маім другім курсе заводы пачалі закрывацца. У палітэху ў мяне быў сусед, які марыў паступіць у інстытут кінематаграфіі і насіў кніжкі кшталту «Вісконці пра Вісконці», а я ўсё за ім чытаў. У той час, праўда, я думаў, што буду прафесійным футбалістам, але потым зразумеў, што я не Бэкхэм, хоць Бэкхэма тады яшчэ не было, і падумаў, што трэба завязваць: у футболе я вялікім не стану, а ў мастацтве можна неяк «праехаць».

Яшчэ смяшнейшая гісторыя пра тое, як курсе на другім знаёмыя ўгаварылі мяне схадзіць на фільм, маўляў, такі круты, нехта збіраўся з дзяўчынай пайсці, але не атрымалася. Тым фільмам аказаліся «Дні зацьмення» Сакурава. Я балдзеў ад гэтага кіно, яно мяне так заваражыла. А потым прыйшоў у інтэрнат і ў мяне пытаюцца: ну як? Аказалася, яны не пайшлі спецыяльна, бо ім сказалі, што гэта нешта мутнае. А мне было супер.

Як з'явілася ваенная тэма

У пачатку нулявых на «Беларусьфільме» быў гучны праект «У жніўні 44-га», які з'еў два бюджэты кінастудыі, пазбавіў усіх працы і ўсе на яго злаваліся. І вось мы сядзелі злыя — я, Аляксандр Качан і Аляксандр Колбышаў, была поўная бесперспектыўнасць — ні грошай, нічога, нудна і дэпрэсіўна. Мы пілі гарэлку і думалі, чаго б такога зрабіць, яко выказацца — на тую ж тэму, але з іншага боку. Першая задума была карыкатурнай: прыходзяць партызаны і пачынаюць капаць — усе думаюць, што яны будуць кагосьці хаваць, а яны адкопваюць самагон і пачынаюць вечарыну. Гэтую ідэю мы пачалі раскручваць, прыцягваць сюды архетыпы — у выніку з'явілася сур'ёзная кароткаметражка «Партызанская містэрыя», якая трапіла пад гнеў Цвяткова з Міністэрства культуры. Да гэтага ён мяне мучыў са здачай «Барана» — больш за паўгода не прымаў фільм. У мяне тады нават барада з'явілася, бо ён сказаў не галіцца, пакуль не здам карціну. А я здаў, толькі яе так доўга прымалі, што ў выніку я стаў выглядаць як Фідэль Кастра. На «Партызнаскую містэрыю» Цвяткоў напісаў вельмі адмоўны артыкул, а я яго падмануў — атрымаў пракатнае пасведчанне, пакуль ён быў у адпачынку. Прэм'еру кароткаметражкі зрабілі ў Музеі кіно, і там было вялікае захапленне. Для пэўнай публікі навела стала проста культавай. Усе казалі: «Здыміце працяг, вы забілі, га́ды, нашага любімага персанажа Штыркіна». І мы падумалі: трэба зрабіць працяг, нягледзячы на тое, што Штыркін ужо забіты. Так нарадзіўся нелінейны сюжэт карціны «Акупацыя. Містэрыі», нам вельмі хацелася зрабіць фільм, дзе канец быў бы пачаткам. У галаве ў мяне быў Серджыа Леонэ з яго вестэрнамі. Помню, адна газета ўвесь час друкавала гісторыі партызанаў, і мне здавалася, што яны ўсе ў капелюшах, таму ў нас таксама быў капялюш з чырвонай зоркай. І музыку я прасіў пісаць у такім стылі.

Пра пераезд у Маскву і серыялы

Я максімальна адцягваў момант пераезду, паслаў Колбышава замест сябе, які ў той момант на нейкім будаўніцтве працаваў. Там ён у выніку купіў машыну, кватэру і стаў больш-менш заможным чалавекам. Канешне, мне было цікава папрацаваць на серыялах дзеля досведу, але я гэта адцягваў, прабіваў свае праекты, нешта прыдумляў. У выніку пасля ўсіх паражэнняў я падумаў: «А паеду здымаць «Операў», там хоць грошы плацяць нармальныя». Праўда, на «Операх» я таксама трапіў у складаную сітуацыю, пачаў перакройваць сцэнарый — ну проста па-свойму весці сябе ў чужым агародзе. Мне кажуць: «Сцэнарый мяняць нельга, слова зменіш — усё!» А я кажу: «Мне можна!» Ну, а куды яны дзенуцца, я ж ужо зняў матэрыял. Прычым я ўсё рабіў лепей. Напрыклад, прыязджаем на дрэнную лакацыю ў пустое, цёмнае памяшканне — я кажу, давайце з ліхтарыкамі ў цемнаце. І яны ідуць з гэтымі ліхтарыкамі — ну клас, інтрыга... Мне за гэтыя ліхтарыкі потым так папала. А акцёры загарэліся! Яны пачалі імправізаваць, бо дагэтуль «ляпілі» дзесяць гадоў, а тут ім усё дазваляюць. Карацей, мне не заплацілі частку грошай.

Потым з'явілася «Кадэцтва». Там было яшчэ весялей, бо плацілі нерэальна шмат грошай, а рабіць нічога не трэба было. Аднойчы я пабываў на здымачнай пляцоўцы ў Арланава, які там здымаў да мяне. І ён пытаецца: «Ну ты зразумеў схему?» Я кажу, а што тут разумець, навошта толькі рэжысёр, не разумею.

Пра ўздзеянне серыялаў

Я працаваў недзе тры з паловай месяцы, гэта мала, а ў іншым выпадку там лёгка захраснуць і сябе страціць: гэта проста паток, часам мы здымалі па 25 хвілін у дзень. Калі сыходзіў з «Кадэцтва», мне дырэктар СТС сказаў: «Мы табе новае жыццё пачалі. У цябе была б кватэра і ўсё, а ты, дурань, — у кіно». Я ўсім расказваю гэтую гісторыю: у нас здымаўся Георгій Марцірасян, такі здаровы акцёр, ён быў самы дарагі. Там былі Сцяклоў, Парахаўшчыкоў, але яны чамусьці каштавалі чатыры тысячы ў дзень, а Жора — сем тысяч. Чаму сем, я не магу зразумець. Ну, твар вядомы. І вось мы здымаем, ён прыходзіць на пляцоўку — а тэкст ён ніколі не памятаў — я яму зачытваю фразу: «Макс, ты ў колькі прыйдзеш дадому?»... Жора стаіць і кажа: «Андрэй, а інтанацыя?» І я яму інтанірую! А ён паўтарае — за сем тысяч у дзень!

Гэты вопыт мне дапамог. У мантажным, сцэнарным ці таніровачным перыядзе заўсёды ёсць мандраж і жаданне ўсё кінуць і збегчы. На здымачнай пляцоўцы гэта ўвогуле першае жаданне. І я заўсёды думаю: а вось калі б я здымаў серыял? І ўсё адразу так добра, камера тут, адваротны пункт, майстар-план, узбуйненне.

У нас мантажом займаўся Барыс Шадурскі, які ў свой час на практыцы быў на нейкім фільме Таркоўскага. Ён ніяк не мог падысці да Таркоўскага, пагаварыць. І недзе ў выніку злавіў, яны засталіся ўдвух, і Барыс запытаўся: «Андрэй Арсеньевіч, у чым сакрэт майстэрства?» Таркоўскі кажа: «Пачынаеш здымаць сцэну з агульнага плана, потым разглядзі, памяняй кропачку, сярэдні план і потым узбуйніся». Я не ведаю, смяяўся з яго Таркоўскі ці не, але Шадурскі сказаў: «Я зразумеў, што гэта геній». Бо яснасць у галаве адразу. Так і на серыялах.

Запісала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

(Працяг чытайце на сайце zviazda.by)

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01

Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а

№ п/п	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год выпуска	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	242	Станок токарно-винторезный типа 1Д63А, тип 163, 1962 г. в.	1 649,96	82,50
2	827	Подмости передвижные электрические ППЭ-1, 2010 г. в.	2 688,00	134,40
3	325	Вагон-общежитие, 1979 г. в.	288,00	14,40
4	17	Токарно-винторезный станок типа 1К-62, 1966 г. в.	992,45	49,62
5	22	Вертикально-сверлильный станок типа 2А-135, 1964 г. в.	365,97	18,30
6	30	Станок универсальный токарный типа 16Е16КВ	597,87	29,89

Порядок ознакомления: ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375 29 654-92-93

Транспорт и оборудование, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе

7	580	Нивелир Н3, 1976 г.	6,96	0,35
8	595	Нивелир Н3К, 1982 г. в.	6,96	0,35
9	385	Люлька строительная ЛЭ-100*300, 1983 г.	110,40	5,52
10	699	Нивелир НВ-1, 2004 г.	9,60	0,48
11	719	Копировальный аппарат Xerox CopyCentre C118	58,80	2,94
12	720	Печь прокалочная ЭПС-10/400СЭ	41,58	2,08
13	850	Выпрямитель для дуговой сварки ВДМ-6303С-У3	163,80	8,19
14	801	Трансформатор сварочный ТДМ 252У2	39,48	1,97
15	611	Сварочный агрегат колесный (САК), заводской № 13859	302,40	15,12
16	838	Автомобиль GAZ-3110, 2003 г. в.	1242,00	62,10
17	358	Вагон-общежитие ОП-4М	832,80	41,64
18	557	Установка «ПЕНА»	164,40	8,22
19	835	Трансформатор сварочный ТДМ-252У2	84,60	4,23

Оборудование, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Мясницкая, 22

20	444	Инвентарное здание КО-2	972,60	48,63

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственные лица: Марчик Петр Иванович, начальник производственного участка СУ-110, тел. +375 29 821-07-71, Соломов Лев Михайлович, мастер производственного участка, тел. 8033-686-66-94

Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254, в составе

21	998	Автобус вагон ГАЗ (GAZ)–2705 (2000 г. в.)	533,80	26,69

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00 по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка, тел. +375 29 603-49-02

Транспорт и оборудование, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 120/2

25	738	Грузопассажирский автомобиль GAZ-2705, 2008 г. в. (рег. знак АВ 4693-1)	3 150,00	157,50

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, начальник производственного участка, тел. +375 29 6592523

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Срок оплаты: при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN — срок оплаты не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 "О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица". К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в газете «Звязда» 24.03.2018 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**17.05.2018** в 11.00 по адресу**: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»**
Дата, место и время окончания приема документов	**15.05.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Начальная цена продажи – 71 280 руб. (семьдесят одна тысяча двести восемьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 7 128 руб. (семь тысяч сто двадцать восемь рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 25 мая 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

